КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 28 (1467)
11 ліпеня 2020 г.

Сёння распачынаецца адно з самых каларытных святаў фестывальнага ліпеня. Куточак Беларусі пад назвай Александрыя ласкава запрашае сваіх сяброў з усіх рэгіёнаў нашай рэспублікі ды іншых краін на імпрэзу, якая ўжо стала адным з яркіх брэндаў у вянку здзяйсненняў беларусаў. Нездарма сёлетні фэст праходзіць пад патранатам UNESCO. Суплёт мастацкіх традыцый і сучасных інавацый адкрые перад шматлікімі гасцямі купальскага форуму панараму ўнікальнай творчасці нацыі (пра сям'ю майстроў, удзельнікаў свята — на ст. 13).
Жадаем плёну ўсім, хто сустрэўся на маляўнічым беразе Дняпра!

Плённых сустрэч на беразе Дняпра!

Напярэдадні падзеі

ПАЗІТЫЎНАЯ ДЫСТАНЦЫЯ ВІЦЕБСКІХ ІМПРЭЗ

"К" распавядае пра тое, якія мерапрыемствы прапануе "Славянскі базар у Віцебску" на вуліцах горада ў дні міжнароднага форуму.

ст. 3

Соцыум

ЧАЛАВЕК У АРХІЎНЫМ ДАКУМЕНЦЕ

Якімі правіламі мусяць кіравацца даследчыкі, каб сумленна падысці да справы стварэння гістарычных дакументаў часу?

ст. 4

Тэма

КАМПЛІМЕНТ З-ПАД ПЯРА МІЦКЕВІЧА Ў ПАДМУРКУ ЛЯДОЎНІ

Камень — самы трывалы матэрыял для захавання гістарычнай памяці. Ад каго залежыць іх лёс?

ст. 5

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Кветкі да помніка Песняру.

Музей у Акопах.

Бэз з пяшчотнай назвай "Паўлінка"

Як праходзіў Купалаўскі суботнік у Акопах

Здымак на памяць.

У чарговы дзень нараджэння Янкі Купалы ў Акопах, на тэрыторыі ландшафтнага заказніка, названага імем Песняра, прадстаўнікі шэрагу культурніцкіх устаноў сталіцы зладзілі свайго роду суботнік. Пад вокнамі хаты, у якой наш геній напісаў "Паўлінку", "Раскіданае гняздо", "Тутэйшых" і іншыя шэдэўры, пасадзілі ў памяць паэта кусты бэзу "Паўлінка".

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ /
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Побач з пасадкамі пастаўлены камень, на якім шыльдачка з тэкстам, што бэз пасаджаны 7 ліпеня 2020 года прадстаўнікамі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы і Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Цэнтральнага батанічніга сада Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Удакладню, што ў дэлегацыі Купалаўскага тэатра былі актрысы, якія ў розныя гады выконвалі на сцэне ролю Паўлінкі.

У музеі.

Да таго ж у гэтай прыгожай акцыі бралі таксама ўдзел супрацоўнікі іншых літаратурных музеяў, Міністэрства культуры, пісьменніцкай грамады, Фонду культуры, грамадскага аб'яднання ўкраінцаў Беларусі "Заповіт".

А пачалася акцыя ўскладаннем белых ружаў, якія паэт па ўспамінах тых, хто яго ведаў, вылучыў сярод іншых кветак, да помніка Песняру ў Купалаўскім парку сталіцы. Сёння Акопы — фактычна мінскі прыгарад. Дабрацца сюды ад цэнтра горада можна хутка і з камфортам, нават не адчуўшы адлегласці. А ў Купалавы часы гэта была тыповая вясковая глыбінка, і выправіцца тады ў Акопы з Вільні ці з Мінска, не кажучы пра Пецярбург, было як наведацца ў іншы свет. Мабыць, за гэта і любіў Янка Купала Акопы. Тут, ва ўтульным вясковым доме (цяпер гэта музей) пасярод прыроды, на той час амаль некранутай, сярод блізкіх яму людзей паэт мог засяродзіцца на творчасці. Менавіта тут ён знайшоў прататыпы ўсіх герояў "Паўлінкі".

Спецыяльна для ўдзельнікаў "Купалаўскага суботніка" была наладжана экскурсія па музеі. Экспазіцыя, якая мае назву "Кропкі моцы", створана летась. У нейкім сэнсе сінонімам "кропкі моцы" можа быць выраз "намоленая месца" — пункт, дзе чалавек з высокімі маральнымі якасцямі і трывалымі жыццёвымі прынцыпамі можа падсілкавацца станоўчай энергіяй. Менавіта як Купала ў Акопах. Музей не толькі ўяўляе з сябе храналогію жыцця і творчасці паэта, але і сумленна распавядае пра час, у якім Купала жыў і тварыў. Мне ў зале, прысвечаным Купалавай драматургіі і сярод іншага — цяжкага шляху да гледача "Тутэйшых", згадалася іранічная сентэнцыя Міхаіла Святлова пра тое, якой мусіць быць мемарыяльная шыльда на ягоным доме — "Тут жыў і ад гэтага памёр..."

Пасадка бэзу "Паўлінка".

Сам сабе экскурсавод.

Дарэчы ,да некаторых Купалавых словаў можна ставіцца як да прароцтва. Усведамляючы агульначалавечы сэнс і высокі клас сваёй драматургіі, ён гаварыў: "Я памру, а "Раскіданае гняздо" застанецца"...

Музей у Акопах, дакладней філіял сталічнага музея Купалы, выдатны ва ўсіх адносінах. Цудоўная экспазіцыя, дзе звыклыя музейныя чынні гарманічна спалучаныя з інтэрактывам; добра захаваны прыродны ландшафт, які сам па сабе ва ўмовах паўзучай урбанізацыі ўжо з'яўляецца музейным экспанатам. А цяпер яшчэ пад акном, з якога Янка Купала глядзеў на свет, будзе расці бэз, названы ў гонар ягонага шэдэўра.

К

Калектыў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім у сувязі са смерцю Грэчкі Валянціны Міхайлаўны малодшага навуковага супрацоўніка філіяла "Музей беларускага народнага мастацтва" ў в.Раўбічы.

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Адказны сакратар — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Алег КЛІМАЎ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Таццяна ПАШЭНЬКА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэклама аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксеёўна.
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксеёўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2020.
Наклад 3134. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 10.07.2020 у 17.00. Замова 2116.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

На сямі вятрах і на пазітыўнай дыстанцыі

Сёлета фестываль “Славянскі базар у Віцебску”, які пачнецца 16 ліпеня, пройдзе ў новым фармаце — амаль усе мерапрыемствы будуць адбывацца на вольным паветры. Шосты раз часткай вялікага песеннага свята стане фэст вулічнага мастацтва “На сямі вятрах”, які таксама ўзбагаціцца новымі прыдумкамі і перформансамі і які, нягледзячы на абставіны, што даводзіцца пераадольваць, павінны атрымацца яшчэ больш маштабным. Бо на гэты раз яго пляцоўка — увесь горад, прынамсі цэнтральная частка, і ніхто не здолее застацца ўбаку ад вулічнага свята. Што рыхтуюць арганізатары, як яны сумясцяць клопат пра бяспеку гледачоў і свае творчыя ідэі, на якія падзеі варта звярнуць увагу — чытайце далей.

Надзея КУДРЭЙКА

“Славянскі базар у Віцебску” ніколі не абмяжоўваўся сценамі і сцэнамі канцэртных ці тэатральных залаў — на вуліцах горада заўсёды адбывалася многа цікавага: былі адкрытыя канцэртныя пляцоўкі, працаваў так званы Горад майстроў, выступалі вулічныя музыканты, і гэтак далей. Але ў 2015 годзе вулічнае фестывальнае жыццё набыло новыя фарбы і проста заблiскацела — па ініцыятыве маладзёжнага тэатра “Кола” Цэнтра культуры “Віцебск”, які натхніўся фестывалямі вулічнага мастацтва ў Мінску, пад час “Славянскага базару” быў праведзены першы падобны фэст — “На сямі вятрах”. Фестывальны горад напоўніўся перформансамі, вулічнымі тэатральнымі спектаклямі, фаер-шоу, жывымі статуямі, святочнымі шэсцямі розных лялек, мімаў, масак і да таго падобнае — па вуліцах вадзілі нават вялікага цмока! І з кожным годам у вулічных святах удзельнічала ўсё больш і больш людзей, усё больш вулічных тэатраў і самых розных артыстаў, мастакоў, паэтаў і музыкантаў.

Сёлета сітуацыя паставіла ўвесь фестываль “Славянскі базар у Віцебску”, і “На сямі вятрах” як яго частку, у новыя ўмовы. Па-першае, у свяце вулічнага мастацтва не прымуць удзел замежныя тэатры і артысты — будуць толькі беларускія, і асноўны цяжар прыпадзе на віцебскі тэатр “Кола”, на віцебскія школу танцаў “Flow dance school” і школу сальсы “De la costa”, на віцебскае шоу бразільскіх барабанаў “Racoon batucada”, на віцебскае фаер-шоу “Атома” і гэтак далей. Хаця будуць, канешне ж, удзельнікі і з іншых гарадоў, іх нямала — барабанны бэнд “Sambatikava” з Мінска, рок-група “Час speak” з вакалісткай Юліяй Глебавай, тэатр-студыя жывых статуй “Класік” з Гомеля, і іншыя.

Па-другое, ад тэатральных спектакляў, якія праводзіліся б на адным месцы, і збіралі б, як і раней, вялікія натоўпы (у мінулыя гады здаралася і па тры тысячы гледачоў адначасова), было вырашана адмовіцца. Увогуле, адным з дэвізаў сёлетняга “сямівятровага” фэсту абраныя словы “пазітыўная дыстанцыя” — павінны быць і дыстанцыя, і радасць адначасова. Перформансы і пастаноўкі стануць перасоўнымі, яны будуць увесь час рухацца, ісці па вуліцах горада, зазіраць на фестывальныя пляцоўкі, і, як кажа аўтар ідэі і кіраўнік праекта “На сямі вятрах” Улада Цвікі, кожны чалавек у цэнтры горада абавязкова сустрэне гэтае свята, зможа на яго паглядзець і ў ім паўдзельнічаць, зможа зрабіць яскравыя фатаграфіі і ўзняць сабе настрой.

Фота з архіва фестывалю “На сямі ветрах”.

Пачынаць рух па вуліцах перасоўныя перформансы будуць бліжэй да вечара, як спадзе спёка, а заканчваць у 22 гадзіны — такім чынам, яны адпрацуюць самы прайм-тайм фестывальных гулянняў. Адпраўная кропка — пляцоўка на Маякоўскага, 1, дзе месціцца Дырэкцыя фестывалю, у адну гадзіну будуць выходзіць два перформансы — а ўсяго іх 15, самых розных. Напрыклад, перформанс “Крылы”: хадульныя касцюмы з двухметровымі крыламі — сем персанажаў як сем вятроў, крылы будуць лунаць у паветры. Ці таксама хадульны перформанс “Графіка ветру”: акцёр працуе з агромністай пылавой плёнкай, і вецер стварае неверагодныя формы з гэтай плёнкі. Не абыдзецца і без любімага гледачамі цмока — гэтая 11-метровая абаяльная пачвара будзе хадзіць па цэнтры горада як цягнік па спецыяльным раскладзе. Пройдуць па вуліцах і разнастайныя буфанадныя маскі — з імі можна будзе абдымацца, фатаграфавацца, па-рознаму ўзаемадзейнічаць — ізноў жа ў адпаведнасці з прынцыпам “пазітыўный дыстанцыі”: бо тут і маскі, і касцюмы, і пальчаткі, усё цалкам бяспечна. Акрамя таго, у самых розных месцах можна будзе сустрэць жывыя статуі з гомельскага тэатра “Класік”.

Па-ранейшаму, усе фестывальныя дні чакаюць гледачоў традыцыйныя пляцоўкі фэсту “На сямі вятрах” — паэзія і аўтарская песня, напрыклад, будуць гучаць у дворыку каля Цэнтра сучаснага мастацтва. Звычайна гэтая пляцоўка збірала ўдзельнікаў з сямі-васьмі краін, але сёлета выступяць толькі беларускія аўтары, і асновай гэтай музычна-паэтычнай дзеі стануць віцебскія Тэатр-студыя аўтарскай песні і літаратурны клуб “ЛитКофейник”.

Дзве пляцоўкі фэсту “На сямі вятрах” будуць абсталяваны гукавой апаратурай. Па адрасе Талстога, 7 (ля Цэнтра сучаснага мастацтва) збярэцца харэаграфічныя калектывы — там знойдзецца месца і для ліндзі-хопа, і для танга, і для брэйк-данса — канешне, у гэтым танцавальным свяце змогуць паўдзельнічаць — патанчыць — і простыя гледачы. Тут жа выступяць прадстаўнікі арыгінальнага жанру, такія як фокуснікі.

А самай вялікай і масавай пляцоўкай, што будзе працаваць не да дзесяці вечара, як іншыя, а да дзвюх гадзін ночы, стане Пушкінская плошча — раней менавіта там паказваліся тэатральныя прадстаўленні, якія збіралі вялікія натоўпы гледачоў. Свята на плошчы стане падобным на open-air: на сцэне выступяць музычныя калектывы, кавер-бэнды і рок-групы — толькі жывы гук, толькі жывая музыка. Там жа на плошчы ўпершыню выставяць машыну аўтагуку — і кожны дзень яна будзе імкнуцца паставіць рэкорд па гучанні, кожны дзень будуць праводзіцца замеры: акрамя ўсяго, яна стане і пляцоўкай для ды-джэяў. Там жа на Пушкінскай плошчы адбудуцца і фаер-шоу, і розныя іншыя перформансы, яна запоўніцца касцюміраванымі ўдзельнікамі — плануецца практычна няспынны маскарад. І задумана так, што ўсё павінна рухацца і віраваць, каб людзі не стаялі на адным месцы і каб атрымлівалася “пазітыўная дыстанцыя”.

На вуліцы Талстога ўвесь дзень да позняга вечара будуць выступаць вулічныя музыканты, там жа свае вырабы раскладуць і расставяць народныя майстры. На Пушкінскім мосце таксама будзе ісці насычанае жыццё... — карацей, усю праграму і не ахопіш.

А сёлета да традыцыйных пляцовак арганізатары дадаюць новую — і яна ў духу віцебскай мастацкай школы: гэтая пляцоўка — неба Віцебска. У сацсетках з’явіцца хэштэг #НебоВитебска, і любы чалавек зможа прыняць удзел у чэленджы, сфатаграфаваўшы неба з фрагментам віцебскай архітэктуры і выклаўшы здымак ва ўласны Instagram. У небе на фота могуць з’явіцца і вершы, і аўтографы, і малюнкі і фатаграфіі любімых людзей — што заўгодна, маўляў, “у Віцебску лятаюць усе і ўсё”. Мяркуецца нават, што па выніках такога флэшмоба будзе вызначаны і пераможца — сёлета з “Сямі вятрамі” шчыльна супрацоўнічае знакаміты віцебскі фестываль “Фотакрок”, і ён з гэтым дапаможа. Акрамя таго, фотамастакі будуць усе дні працаваць на святочных вуліцах, а па выніках працы яны плануюць нават выдаць кнігу. Не толькі ў фота адлюстроўваецца фэст вулічнага мастацтва “На сямі вятрах” — традыцыйна вядзецца мноства стрымаў, і ў інтэрнэце за пяць мінулых гадоў можна знайсці ажно два мільёны відэа! Відавочна, сёлетні “Славянскі базар у Віцебску” моцна павялічыць гэтую лічбу.

Асаблівасць фэсту “На сямі вятрах” у тым, што ён праводзіцца практычна на валанцёрскіх пачатках, а яго артысты выступаюць, прыязджаюць на віцебскае свята, рыхтуюцца да яго, ствараюць касцюмы і прыдумваюць належнае абсталяванне, як правіла, толькі за свой кошт. Гэта менавіта Аматары з вялікай літары. Як расказвае Улада Цвікі, людзі імкнуцца на фестываль таму, што проста прагнуць паказаць сваё майстэрства іншым, бо падобных магчымасцяў у звычайным жыцці яны маюць не так шмат. І як толькі адкрываюцца заяўкі на ўдзел у фэсце “На сямі вятрах”, яны тут жа і запаўняюцца жадаючымі, і арганізатарам даводзіцца адмаўляць усім астатнім, хто проста не паспеў. Сёлета ў гэтым вулічным свяце будзе задзейнічана каля 400 артыстаў. І хочацца спадзявацца, што яно атрымаецца якім і задумана — і пазітыўным, і бяспечным.

К

Чалавек у архіўным дакуменце

Прамоўленае рэспандэнтам

Усё часцей на паліцах кнігарань можна пабачыць выданні, прысвечаныя мінуўшчыне тых ці іншых населеных пунктаў. Такія працы грунтуюцца, не ў апошнюю чаргу, на запісах вусных успамінаў іх жыхароў. Прычым гаворка можа ісці не толькі пра гарады ды мястэчкі, але нават пра вёскі. Але ці кожны запіс такіх успамінаў можна лічыць паўнавартаснай гістарычнай крыніцай? Якімі правіламі мусяць кіравацца даследчыкі, каб сумленна падысці да справы стварэння падобных дакументаў часу?

Антон РУДАК

Інфармацыяй, якую паведамляюць пры размове відавочцы мінуўшчыны, займаецца такі накірунак, як вусная гісторыя. У шырокім сэнсе гэты метад вядомы з пракаветных вякоў — яшчэ ў часы Герадота гісторыкі скарыстоўвалі ў сваіх працах звесткі, атрыманыя з вусных паведамленняў сведкаў падзей. Але ў вузкім сэнсе, як строга акрэслены навуковы метад, вусная гісторыя сфарміравалася толькі ў XX стагоддзі, са з'яўленнем адмысловых тэхнічных інструментаў, якія дазваляюць дакладна зафіксаваць гаворку чалавека — аўдыё- і відэаапаратуры. Вусная гісторыя даследуе як само мінулае, так і асаблівасці памяці аб ім — шляхам запісу, захавання і аналізу інтэрв'ю са сведкамі ці ўдзельнікамі падзей. Важным складнікам прытым з'яўляецца і наступная інтэрпрэтацыя вуснай крыніцы.

ВІРТУАЛЬНЫ, ДАСТУПНЫ ДЛЯ ЎСІХ

У Беларусі першыя інтэрв'ю з відавочцамі гістарычных падзей запісваліся ўжо ў паваенны час — дастаткова прыгадаць хаця б кнігу Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка "Я з вогненнай вёскі", якая змяшчала запісы расповедаў сведкаў карных акцый нацыстаў у гады вайны. Дарэчы, у шэрагу выданняў кніга выходзіла разам з пласцінкамі, на якіх можна было праслухаць і галасы саміх відавочцаў. Гэтаксама часам запісваліся на стужку і ўспаміны ўдзельнікаў вайны, краязнаўчыя звесткі, фальклор... Аднак, так ці інакш, часам інфармацыя з гэтых запісаў падлягала рэдагаванню, страчваўся кантэкст.

Найбольшае развіццё ў Беларусі вусная гісторыя атрымала ўжо ў XXI стагоддзі. Сёння ў нашай краіне ў гэтым кірунку працуе дастаткова невялікае кола даследчыкаў, большасць з якіх аб'яднаныя вакол створанага ў 2011 годзе Беларускага архіва вуснай гісторыі. Гэтая грамадская арганізацыя займаецца запісам, захаваннем і папулярызацыяй успамінаў-інтэрв'ю жывых сведкаў часу. Перш гісторыкі вырашылі абагуліць тыя запісы, якія ўжо былі сабраныя на момант стварэння архіва, а таксама працягваць займацца мэтанакіраваным стварэннем новых гістарычных крыніц такога кшталту. Інтэрв'ю, сабраныя архівам, размяшчаюцца на ягоным сайце ў інтэрнэце па адрасе nashapamiac.org, дзе пасля рэгістрацыі да іх можа мець доступ кожны даследчык у любой кропцы зямнога шару.

Ірына Кашталян, якая каардынавала дзейнасць Беларускага архіва вуснай гісторыі ад яго стварэння да 2015 года, зазначае, што з вуснагістарычнымі дакументамі рэспандэнтаў, якія паходзілі з Беларусі, яна пачала сутыкацца яшчэ ў пачатку 2000-х, і тады зацікавілася гэтай тэмай. Напрыклад, нават у так званым Архіве Стывена Спілберга, створаным па ініцыятыве гэтага славутага кінарэжысёра, дзе захоўваюцца, між іншага, матэрыялы, якія ён выкарыстоўваў у час працы над сваім знакамітым фільмам "Спіс Шындлера", сярод 50 тысяч інтэрв'ю са сведкамі Халакосту можна адшукаць больш за 600 запісаў з Беларусі.

Архівіст Вольга Іванова з 2000-х гадоў вывучала беларускія асабістыя архівы, часткі якіх у выніку тых ці іншых гістарычных падзей сёння раскіданыя па розных установах і краінах. Даследчыца заўжды цікавілася адлюстраваннем чалавека ў архіўным дакуменце. Таму цікаўнасць да вусных успамінаў як дакументаў, якія фіксуюць памяць, быў натуральным працягам яе вышукаў. Калі ствараўся Беларускі архіў вуснай гісторыі, Вользе Івановай прапанавалі, як дасведчанаму архівісту, упарадкаваць і сістэматызаваць зборы. Што ж яны змяшчаюць?

На сёння архіў утрымлівае інтэрв'ю, запісаныя амаль ад паўтара тысячы рэспандэнтаў — прычым саміх запісаў крыху больш, бо з некаторымі людзьмі адбывалася па некалькі гутарак. Агулам архіў налічвае амаль восем тысяч дакументаў — бо акрамя ўласна запісаў гутарак, даследчыкі збіраюць таксама электронныя копіі іншых відаў крыніц — фотаздымкаў, пасведчанняў і гэтак далей. Важнай формай працы з запісанымі ўспамінамі з'яўляецца іх транскрыбіраванне, апісанне, пазначэнне дат, імёнаў, геаграфічных назваў і тэм, якія згадваюцца ў інтэрв'ю. Усе гэтыя звесткі аблягчаюць даследчыкам пошук дакументаў на сайце.

Сайт Беларускага архіва вуснай гісторыі.

ВЫСЛУХАЦЬ І ЗАФІКСАВАЦЬ

Беларускі архіў вуснай гісторыі займаецца не толькі захаваннем дакументаў, але і іх мэтанакіраваным зборам. Аб'яднаныя вакол архіва даследчыкі ў розныя гады ладзілі ў шэрагу рэгіёнаў Беларусі экспедыцыі, прысвечаныя запісу інфармацыі аб такіх важных і трагічных падзеях гісторыі, як даваенны і паваенны голад на Палессі, калектывізацыя, далучэнне Заходняй Беларусі да СССР у 1939 годзе.

Даследчыкі адзначаюць, што выкарыстоўванне метаду вуснай гісторыі дае магчымасць для архівіста самому ўдзельнічаць у стварэнні дакумента, закласці накірункі і метады яго далейшага даследавання. Для паўнаты захавання звестак, атрыманых ад рэспандэнта, падчас інтэрв'ю адбываецца паралельная фіксацыя на аўдыё і відэа. Па-першае, гэта страхуе ад памылак тэхнікі, па-другое — дазваляе зафіксаваць каштоўную невербальную інфармацыю — рухі, жэстыкуляцыю, міміку суразмоўцы.

Каштоўнасць такіх інтэрв'ю, запісаных згодна з усімі правіламі, у тым, што яны дазваляюць найбольш дакладна і поўна зафіксаваць сведчанні аб мінулым, а пасля гэтак жа дакладна іх інтэрпрэтаваць. Гэта здымае праблему магчымай маніпуляцыі, вырывання з кантэксту. Хаця, вядома, любы вуснагістарычны дакумент мае патрэбу ў супастаўленні з іншымі відамі крыніц — бо нават сведкі падзей мінуўшчыны могуць не мець рацыі, наўмысна ці ненаўмысна скажаць звесткі.

Вусная гісторыя мае сваю методыку збору сведчанняў, і парады па запісе інтэрв'ю можна было б пералічваць доўга. Кожная гутарка патрабуе пэўнай падрыхтоўкі, складання апытальніка, выбару магчымых тэм. Але перадусім, бадай, важна проста ўважліва слухаць суразмоўцу і не перабіваць яго. Ёсць свая спецыфіка і ў выбары ды пошуку суразмоўцы: у пэўнай ступені, у вёсцы збіраць успаміны лягчэй — там патрэбнага чалавека можна сустрэць проста на вуліцы, ды й усе, збольшага, ведаюць адзін аднаго. Але і ў гарадскіх умовах збор успамінаў мае свае плюсы — тут можна, пры жаданні, запісаць успаміны людзей, якія пераехалі ў горад з розных куткоў рэгіёна ці нават цэлай краіны. Варта толькі адшукаць неабходнага суразмоўцу — і атрымаць ягоны давер.

Акрамя збору ды захавання вусных успамінаў, Беларускі архіў вуснай гісторыі надае вялікую ўвагу папулярызацыі самога гэтага накірунку. Доўгі час у навуковых колах захоўваўся пэўны скепсіс да вуснагістарычных крыніц, але прыхільнікі гэтага метаду прыкладаюць усе намаганні, каб змяніць сітуацыю да лепшага і ўмацаваць месца і ролю вуснай гісторыі ў акадэмічнай навуцы — вядома ж, пры ўмове супастаўлення такіх звестак з іншымі відамі дакументаў.

Як кажа сённяшні каардынатар архіва Андрэй Мастыка, цяпер задача асяродку палягае перадусім у папулярызацыі метаду вуснай гісторыі, распаўсюджанні ведаў аб яго прымяненні. Неабходны выхад у рэгіёны, стварэнне асяродкаў, якія займаліся б зборам інфармацыі ў розных кутках краіны, бо ахапіць усю Беларусь, як і ўсё багацце тэм, даволі цяжка. Тым часам, існуе таксама праблема імклівай страты рэспандэнтаў — сведкі мінулых гадоў няўмольна сыходзяць з жыцця, а разам з імі страчваецца і памяць аб мінулым, індывідуальная для кожнага.

ГІСТОРЫЯ ВЁСКІ Ў ПАМЯЦІ ЖЫХАРОЎ

Вусныя ўспаміны сёння ўсё шырэй выкарыстоўваюцца ў навуковых і дыдактычных выданнях. Напрыклад, зусім нядаўна ўспаміны Беларускага архіва вуснай гісторыі былі выкарыстаныя ў дапаможніку "Незабытыя ахвяры вайны", выпушчаным накладам 150 асобнікаў, які ўжо амаль цалкам разышоўся па навучальных установах краіны. На прыкладзеным да зборніка дыску можна пабачыць 104 фрагменты з 35 інтэрв'ю ахвяр нацызму.

Удзельнікі каманды архіва выкарыстоўваюць метады вуснай гісторыі і ў іншых сваіх даследаваннях. Так, напрыклад, Вольга Іванова ў 2018 годзе выдала кнігу "Прамоўленая гісторыя. XX стагоддзе ў памяці жыхароў беларускай вёскі", у якой былі сабраныя ўспаміны рэспандэнтаў з розных куткоў Беларусі. А сёлета з'явілася і новая кніга даследчыцы — "Ліпляны. Біяграфія і штодзённасць беларускай вёскі". Гэтае выданне прысвечанае ўжо канкрэтнай мясціне — аграгарадку ў Лельчыцкім раёне Гомельскай вобласці.

Кніга гэтая з'явілася сёлета па ініцыятыве бізнесмэна Ігара Жабароўскага, які нарадзіўся ў Ліплянах. Каб захаваць памяць пра гісторыю гэтай мясціны, ён вырашыў звярнуцца да адмыслоўцаў па вуснай гісторыі, якія запісалі б успаміны старажыхароў. Вольга Іванова адзначае, што ім было цікава ўзяцца за такую працу, бо Ліпляны знаходзяцца ў дужа прывабным для даследчыкаў рэгіёне — гэта так званае Убарцкае Палессе (назва — ад ракі Убарць). У сэнсе этнаграфіі і гісторыі гэта даволі архаічны, аўтэнтычны край, дзе захавалася многа слядоў мінуўшчыны. Да таго ж, існуе больш вуснагістарычных даследаванняў з захаду Палесся, чым з усходу — рэч у тым, што Заходняя Беларусь перажыла цягам XX стагоддзя больш змен і трансфармацый, таму, магчыма, і звяртае на сябе ўвагу гісторыкаў часцей. Тым больш цікава было цяпер паглыбіцца ў мінулае ўсходнепалескай вёскі.

Яшчэ адзін плюс у выбары Ліплян як аб'екта для збору вусных успамінаў — вёска даволі вялікая, каб можна было атрымаць рэпрэзентатыўную выбарку і скласці большменш праўдзівае ўяўленне аб тым, што тут адбывалася. Пятнаццаць рэспандэнтаў былі знойдзеныя ў саміх Ліплянах, а яшчэ сямёра нарадзіліся тут, але цяпер жывуць у гарадах. Дарэчы, жыхары вёскі носяць усяго чатыры прозвішчы: Казачэнка, Лось, Паўлечка і Сечка, прычым усе гэтыя роды вядомыя па дакументах яшчэ з XVIII стагоддзя. Кніга змяшчае таксама звесткі аб гісторыі Ліплян да XX стагоддзя, вядомыя з пісьмовых крыніц — але асноўную яе частку складаюць менавіта запісы вусных успамінаў жыхароў. На жаль, некаторыя з рэспандэнтаў за тры гады, якія прайшлі ў працы над кнігай, нават паспелі ўжо пакінуць гэты свет.

Вядома, у расповедах жыхароў, акрамя апісання штодзённасці вёскі, найчасцей згадваліся часы найбольшых узрушэнняў: голад, войны, змены ўлады. Напрыклад, адна з апавядальніц падчас інтэрв'ю раптам пачала спяваць песню на польскай мове. Гісторыкі былі здзіўленыя — Ліпляны ж былі ў міжваенны час па ўсходні бок Рыжскай мяжы. Аказалася, што маці рэспандэнткі памятала, як яшчэ падчас Савецка-польскай вайны ў 1920 годзе ў вёсцы спыняліся на пастой палякі, і салдаты спявалі песню, якую жанчына запомніла і нават перадала сваёй дачцэ. Немалое месца займаюць ва ўспамінах ліплянцаў, натуральна, і часы нацысцкай акупацыі, Халакост, аблавы, вываз людзей на працу ў Германію. Падчас Вялікай Айчыннай вайны вёска была спаленая, а яе жыхарам даводзілася хавацца сярод балот. Усе рэспандэнты безумоўна называюць гады акупацыі найцяжэйшым часам на сваёй памяці.

Дапамог пры стварэнні кнігі таксама летапіс вёскі, які вядуць яшчэ з 1970-х гадоў у тутэйшай школе. У выданне ўвайшлі і запісаныя яшчэ за савецкім часам успаміны франтавікоў, якіх даўно няма сярод жывых. Кніга таксама змяшчае звесткі аб мікратапаніміцы вёскі, музыцы і спевах, абрадах, тут можна знайсці ўзоры вясковай лірыкі, замоваў, мясцовы слоўнік. У дадатку змешчаныя спісы жыхароў, якія загінулі падчас войн XX стагоддзя або былі вывезеныя на працу ў Германію. Да кнігі прыкладаецца дыск, на якім можна прагледзець фільм аб вёсцы, пачуць жывую гаворку ліплянцаў, пабачыць карту гэтых мясцін 1866 года.

На жаль, з-за сённяшняй эпідэміялагічнай сітуацыі прэм'еру кнігі ў самой вёсцы давялося пакуль адкласці. Але тыя з ліплянцаў, хто ўжо меў магчымасць азнаёміцца з вынікам працы гісторыкаў, надта расчуліліся. Як ні дзіўна, з кнігі яны багата дазналіся адзін пра аднаго такога, чаго раней нават не ведалі. А значыць, задача даследчыкаў сапраўды выканана, і метад вуснай гісторыі ў гэтым выпадку апраўдаў сябе, паказваючы, як працуе калектыўная памяць. Добра было б, каб некалі кожны склаў падобную кнігу ўспамінаў пра сваю вёску, раён ці вуліцу ў горадзе. Памяць аб нашай агульнай мінуўшчыне так і складаецца — з мноства згадак розных людзей аб малой радзіме, якая ў кожнага свая.

К

Камплімент з-пад пяра Міцкевіча ў падмурку лядоўні

Ад каго залежыць лёс раскіданых каменных сведкаў мінулага?

Тое, што камень — гэта самы трывалы матэрыял для захавання гістарычнай памяці, разумелі яшчэ ў старажытнасці — ды пакідалі на іх адбіткі. Часы пазнейшыя, з іх войнамі ды катаклізмамі, гэта пацвердзілі. Многія з памятных камянёў, якія можна ўбачыць на нашых землях — апошнія сведкі тых ці іншых гістарычных падзей. Часам яны даюць штуршок даследчыкам, скіроўваючы іх пошукі ў пэўны бок — бо архівы не ацалелі. А часам і наогул з'яўляюцца адзіным напамінам пра свае "родныя" мясціны ды іх гаспадароў. І менавіта таму гэтыя камяні вартыя нашай увагі. Што, на жаль, пакуль разумее далёка не кожны з тых, ад каго залежыць іх лёс.

Камень Станіслава Манюшкі "1865" (Страшны двор).



Камень Адама Міцкевіча. 2020 год.

Камень "1795" (Дзедаў камень). 2020 год.

ЛЕГЕНДЫ "СТРАШНАГА ДВАРА"

Напачатку года мы пісалі пра важную знаходку ў колішнім маёнтку Станіслава Манюшкі Радкоўшчыне. Ад сядзібы, якой спярша валодаў знакаміты дзядзька кампазітара Дамінік, захавалася адна лістоўніца. Ад капліцы на вясковых могілках, дзе былі пахаваныя бацькі кампазітара Чэслаў і Альжбета Манюшкі, нават і падмуркаў не ацалела. Таму знойдзенае сёлета каменнае крэсла 1827 года, спярэшчанае надпісамі, зробленымі ці то самім Дамінікам, ці то майстрам-каменачосам па ягонай просьбе, выклікала вялікі ажыятаж. Акрамя крэсла, ёсць там і памятны валун, які Чэслаў Манюшка прысвяціў сваёй маці — Эве з Вайніловічаў.

А вось камяні, які складалі пэўны мемарыял, і якія Чэслаў паставіў у гонар Дамініка, яшчэ ў 1990-х былі перавезены ў суседнюю вёску Алесіна ды ўсталяваныя там на пачэсным месцы. Намаганнямі мясцовай улады напрыканцы вясны туды пераехала і каменнае крэсла — што забяспечыць і ўвагу да яго, і захаванасць.

Аднак гэта далёка не ўсе "Манюшкавы камяні" на нашых землях. Тры гады таму падчас краязнаўчай вандроўкі з сябрамі ў Смілавічы мне ўдалося знайсці яшчэ два камяні. Паколькі яны ўмураваныя ў сцены палаца (ці, дакладней, палацаў — Старога і Новага), які з-за рэстаўрацыі ўжо шмат гадоў аточаны парканам, доступ да іх даволі праблематычны. Знайсці ў Сеціве інфармацыі пра гэтыя камяні не ўдалося абсалютна аніякай.

Адзін з іх, на якім выбітая дата "17 Julii 1754", умураваны ў сцяну на ўзроўні галавы. Магчыма, там увекавечаны дзень сканчэння пабудовы Старога палаца, пра які мы ведаем вельмі мала. Іншая значная падзея, якая адбылася ў тыя часы ў жыцці Завішаў (менавіта яны тады валодалі Смілавічамі), мне невядомая. У кожным разе, дата на камяні дае даследчыкам нітку для пошукаў, і варта за яе пацягнуць.

Другі камень, які да пачатку рэстаўрацыі, верагодна, быў схаваны пад

Новы палац, Смілавічы.

Камень "1865" пасля рэстаўрацыі.

зямлёй, умураваны ў падмурак Новага палаца. На ім таксама змешчаная дата — "R.1865". Тры гады таму, калі падмуркі былі ачышчаныя ад бітай цэглы і зямлі, камень можна было добра разгледзець. Увесну мы ізноў пабывалі ў Смілавічах. І заўважылі, што рэстаўратары яго амаль цалкам затынкавалі, але зрабілі для яго абаронча мур. Таму не ведаючы, што шукаць і дзе, камень гэты наўрад ці знойдзеш. А шукаць яго варта.

У 1865 годзе ў Варшаве з вялікім трыумфам адбылася прэм'ера чарговай оперы Станіслава Манюшкі "Страшны двор". Яна выклікала неверагодную эмацыйную рэакцыю ў часткі грамадства, бо ў ёй былі пэўныя намёкі на трагічныя падзеі паўстання 1863 года. Сярод іншых — назва маёнтка Калінава, дзе адбывалася дзея.

Існуе паданне, што ў оперы за прататып "страшнага двара" быў узяты Стары палац у Смілавічах. А гісторыя пра сапсаваныя куранты, якія ажыўляюць партрэты, нібыта была расказаная малому Стасю ягонымі сваякамі. Дарэчы, стары гадзіннік са Смілавічаў цяпер знаходзіцца ў Каралеўскім замку ў Варшаве.

А камень у падмурку, на шчасце, застаўся. На маё меркаванне, ён таксама наўпрост звязаны з операй. Такім чынам сваякі вырашылі адзначыць і трыумф кампазітара, і тое, што палац патрапіў "на шырокі экран". Але каб дата не выклікала цікаўнасці "соглядатаев" — бо пасля паўстання на беларускіх землях лютавала рэакцыя — яго і ўмуравалі ў падмурак. І таму толькі знаўцы маглі б паказаць яго і распавесці, што да чаго.

Сёння гэты камень — нібы дыямент у кароне з больш важкіх у прамым сэнсе манюшкавых рубінаў і сапфіраў. І, спадзяюся, ён прыцягне ўвагу даследчыкаў і экскурсаводаў. Як яе ўжо прыцягнуў "Дзедаў камень" (з імёнамі дзядоў кампазітара), які быў калісьці ўмураваны ў "дом для прыслугі" і меў надпіс "Ru 1795. D.30 julij. Stan. I Ewa z Woynil. MONIUSZKOWIE Sedz. W.W.X.L.". Ён добра вядомы ўсім, хто цікавіцца гісторыяй Смілавічаў.

СТЫМУЛ ДЛЯ ЗАХАВАННЯ

Як мы бачым на прыкладзе Манюшкаў, традыцыя ўпрыгожваць муры палацаў і замкаў камянямі з важнымі датамі была даволі распаўсюджанай. Можна не сумнявацца, многія сядзібы, якіх у Беларусі былі тысячы, таксама мелі свае памяткі. Але захавалася іх вельмі і вельмі мала. І разам са спаленымі ці разабранымі на дровы дварамі, знікалі або знаходзілі новае прызначэнне і ўпрыгожаныя надпісамі камяні. Што ўжо казаць, калі сёй-той не грэбаваў выкарыстоўваць у падмурках новых пабудоў нават надмагільныя пліты!

Таму кожны ацалелы сведка мінулага — на вагу золата. А калі ён яшчэ і звязаны з гісторыяй вялікага роду або знакавай асобы, якая складае гонар нацыі, то вартасць такога каменя і наогул складана пераацаніць.

Тут мне прыгадваецца валун у падмурку сядзібы Дамейкаў у Жыбартоўшчыне блізу Дзятлава. Некалькі гадоў таму былы маёнтак, ад якога амаль нічога не засталося, набыў прыватнік. Падчас святкавання 215-й гадавіны Ігната Дамейкі, якая ў Беларусі адзначалася на дзяржаўным узроўні і з вялікім размахам, на радзіму "Дона Ігнасіа" прыехалі шматлікія сваякі. Як удзельнік канферэнцыі, разам з імі я пабываў і ў Жыбартоўшчыне. І памятаю, як моцна мяне ўразіў надпіс "1819.R. Ignacy DOMEYKO".

Зразумела, што камень гэты "працаўладкаваў" дзядзька Ігната, таксама Ігнат, які і пабудаваў сядзібу. Але сама думка пра тое, што тысячы людзей краналі яго сваімі рукамі — а сярод іх, можа, былі і рукі вялікага беларуса і Нацыянальнага героя Чылі, не можа не ўзрушваць! І проста сапраўдны цуд, што камень гэты не знік, не апынуўся ў склепе нейкай хаты, якая пазней была знесеная экскаватарам.

Камень — бадай галоўная адметнасць непрыгляднага сёння сядзібнага дома, які стаіць у руінах і патрабуе неадкладнай канвервацыі. Было б вельмі добра, каб уласніку ў гэтай справе дапамаглі і дзяржаўныя структуры. Тым болей, камяніца сваё ўжо адслужыла, будучы лякарняй.

НАНОЎ СТРАЧАНЫ РАЙ

І тут самы час распавесці пра нядаўнюю знаходку, на Гарадзейшчыне. І датычыцца яна найлепшага сябра Ігната Дамейкі Адама Міцкевіча.

Гэтай вясной нясвіжскі краязнаўца Аляксандр Абрамчык адшукаў у вёсцы Студзёнцы бліз Гарадзеі камень з надпісам "Ewa raj utracila Tys go wskrzesila". Раней ён знаходзіўся ў парку сядзібы — ад чаго не засталося ўжо і напаміну. Будуючы сабе лядоўні, адзін мясцовы жыхар забраў гэты камень на падворак і змясціў яго ў падмурак. Пэўна, нічога не ведаючы пра гісторыю таго валуна.

А яна цікавая. Адам Міцкевіч, наведаўшы маёнтак, настолькі ўразіўся яго хараством, што напісаў у альбоме гаспадыні: "*Ева рай страціла, а ты яго ўваскрасіла*". А тая пазней увекавечыла гэты шыкоўны камплімент і сам візіт знакамітага паэта. І хоць не сам ён у скураным фартушку рупліва апрацоўваў валун, знаходка ўсё адно важная. І таму вельмі дзіўна, што ўвагу да каменя пакуль выказваюць толькі краязнаўцы і журналісты. Выглядае, што тым жа музейшчыкам да яго вялікай справы няма.

Параўноўваю гэты выпадак і тое, як развіваліся падзеі пасля знаходкі каменнага крэсла Дамініка Манюшкі. Нацыянальная Акадэмія навук накіравала адмыслоўца, які правёў даследаванне, апісаў камяні, нанёс іх каардынаты на карту Беларусі. Пасля чаго ім быў надазены статус помніка археалогіі.

Падаецца, падобны алгарытм, можа быць выкарыстаны і ў гэтым выпадку. Тым больш, што і ў першым, і ў другім выпадках гаворка вядзецца пра асобаў, якія з'яўляюцца гонарам беларускай нацыі. Таму камень у Студзёнцы, без сумневу, патрабуе самай неадкладнай увагі. Хаця б з таго меркавання, што нават камяні маюць звычку знікаць.

Зміцер ЮРКЕВІЧ
Фота аўтара
і Марыі СЫРАКВАШ

Лялька — не цацка, а твор мастацтва

Мастацтва аўтарскай лялькі параўнальна новае, але ўжо прызнанае часткай "вялікага" выяўленчага мастацтва. Сапраўдны лялечны бум адбываецца па ўсім свеце — мноства майстроў, мастакоў, калекцыянераў, дызайнераў захопленыя лялькамі: а яны могуць быць самымі рознымі, выкананымі ў мноства арыгінальных тэхнік. Адна з першых, хто ў Беларусі на прафесійным узроўні пачаў ствараць аўтарскіх персанажных лялек, — Анастасія Адамовіч. Днямі ў Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва ў Мінску адкрылася яе персанальная выстава "Задолле". Што гэта за дзіўны лялечны свет і як у яго трапіць — пагутарым з мастаком Анастасіяй АДАМОВІЧ.

Надзея КУДРЭЙКА / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

— Самое слова "лялька" найперш выклікае асацыяцыю з дзіцячай цацкай, як з нечым забаўным і несалідным. І ў мастацкім свеце, магчыма, да "лялечнікаў" не самае сур'ёзнае стаўленне. Вам даводзілася з такім сутыкацца?

— Асабіста мне не даводзілася, бо мяне сур'ёзна ўспрымаюць ужо досыць даўно — недарма ж я называю сябе мастаком. Але я разумею, у чым карані падобнага стаўлення. Тэрмін "мастак па лялках", а не "лялечнік" ці "лялечны майстар", я прыдумала сабе сама для больш дакладнага вызначэння. А зараз многія займаюцца лялькамі, і ў нас у Беларусі таксама нямала таленавітых творцаў. Але ж на нейкіх штогадовых выставах кшталту "Млына" можна пабачыць самае рознае. І часта для мяне гэта нават нейкі асабісты боль, калі я бачу, як прафаніруецца мая прафесія. Тое, што раблю я з пэўнымі ведамі і здольнасцямі, з доляй перфекцыянізму, з арыгінальнай мастацкай думкай і вобразам, ставіцца такім чынам на адну палічку з аматарскай творчасцю, з "ширпотребом", з няўмелым капіраваннем чужых ідэй, з нізкім нават тэхналагічным узроўнем, не кажучы ўжо пра мастацкі.

— У сэнсе, вашу працу можна параўнаць з працай мастака ці скульптара, і лялька — гэта такі ж мастацкі твор, толькі створаны па сваіх законах?

— Абсалютна правільна. Насамрэч за кожнай лялькай стаіць цэлая гісторыя, і нават самая маленькая дробязь, нават нейкі кавалачак карунка ці гузік працуюць на сюжэт і вобраз. Гэта не проста трохмерны аб'ект — гэта як ажыўшая ілюстрацыя, ажыўшая карціна. І спецыялісты, што бачаць мае працы, ніколі не скажуць — падумаеш, у мяне ў дзяцінстве таксама былі пупсы і лялькі, што тут такога асаблівага! Канешне, мае значэнне агульная мастацкая адукаванасць гледачоў, здольнасць адрозніць адно ад другога. А неабазнаныя ў мастацтве людзі, дарэчы, часта змяняюць сваё меркаванне, калі даведваюцца, колькі могуць каштаваць такія лялькі, — спачатку здзіўляюцца, а потым прасякаюцца павагай і імкнуцца зразумець, у чым тут сэнс. Хаця здараюцца і выпадкі, што нехта абураецца, бо думаў купіць ляльку за 5 рублёў, а яна, аказваецца, каштуе 500.

— Дарэчы, а колькі могуць каштаваць аўтарскія лялькі?

— Свае працы я раблю для самай рознай аўдыторыі, па самых розных коштах. Асобная гаворка, калі я на заказ ствараю партрэтную ляльку — не жывапісны партрэт, а ляльку. Ва ўсім свеце зараз многа калекцыянераў, якія сочаць за працэсам, за творчасцю сваіх любімых мастакоў. Гэтая мастацкая плынь — аўтарскія лялькі — увогуле зараз на ўздыме, і на сусветным рынку цэны могуць быць нават да некалькіх тысяч еўра.

— А ці многія ў Беларусі праводзяць персанальныя выставы аўтарскіх лялек?

— У прынцыпе, займацца лялькамі як хобі нікому ж не забаронена, любы можа зладзіць сабе нешта падобнае. Але сур'ёзныя персанальныя выставы, па-мойму, адбываюцца не так ужо і часта. Мая першая была ў 2009 годзе, і музеі сапраўды рады мяне бачыць, хочуць, каб мае творы ў іх падоўгу стаялі — бо тыя збіраюць наведнікаў. Праўда, выстаўляцца часта я не магу, бо не заўсёды ёсць належная колькасць экспанатаў — лялькі ствараюцца доўга, іх няшмат, а каб сабраць дастаткова твораў для выставы, трэба гадамі нічога не прадаваць — а лялькі разыходзяцца, разлятаюцца ў розныя краіны. Вось на гэтай выставе, што адкрылася 8 ліпеня ў Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва ў Мінску, 21 праца — гэта тое, што назбіралася за некалькі гадоў, персанажы з беларускага бестыарыя: Дамавік, Лесавуха, Скарбнік, Лазнік, Русалка і гэтак далей. А яшчэ малюнкі.

— Стварэнне аўтарскіх лялек зараз з'ява даволі распаўсюджаная, хоць і параўнальна новая. Вы ў Беларусі, наколькі я разумею, адной з першых заняліся лялькамі на сур'ёзным узроўні.

— На тое, што гэта стала масавай з'явай, моцна паўплывала з'яўленне новых тэхналогій і даступнасць самых розных матэрыялаў. А калі я пачынала, многае даводзілася самой прыдумваць — традыцыйныя гліна ці фарфор для маёй мэты не падыходзілі, быў толькі прасцейшы пластык, які я фарбавала. А зараз усё можна купіць, індустрыя прапануе самае рознае — і прафесійныя палімеры, і валасы для лялек на любы густ — я, напрыклад, карыстаюся шэрсцю ламы, а спецыяльныя, лялечных маштабаў карункі заказваю ў майстрыхі з Францыі. Цяпер любы чалавек на аматарскім узроўні можа пачаць ляпіць лялек. І мяне часта просяць правесці майстар-клас — па лепцы твару, ці рук, ці яшчэ чаго. А я кажу, што пачынаць лепку твару трэба са спробы намаляваць гіпсавы шар! А потым вывучыць анатомію, навучыцца маляваць партрэты і тыя ж рукі, выпрацаваць свае мастацкія ідэі — бо навошта вам капіраваць мае твары і мае рукі? У сэнсе, многае трэба ўжо ўмець, перш чым брацца за ляльку. І я доўга вучылася — скончыла мастацкі ліцэй, які зараз Гімназія-каледж мастацтваў, а ў Акадэміі атрымала прафесію мастацтвазнаўцы. І як мне растлумачыць такому неадукаванаму аматару, што для кожнага персанажа я ляплю індывідуальныя рукі — у Бабы-Ягі яны з артрытнымі костачкамі, у Лазніка іншыя — прыплясканыя і вільготныя, Скарбнік мае тонкія доўгія пальцы, бо акрамя пералічвання грошай цяжкай работы ён не ведае, і гэтак далей? А я ж чую калі-нікалі: "Лялькі робіце? Мая маленькая пляменніца таксама іх робіць, вельмі падобна". Ну што тут скажаш.

— Вы ствараеце толькі добрых лялек, абаяльных? Нават калі гэта Баба-Яга да прыкладу.

Баба Яга, Лазнік, Русалка.

— Мабыць, мая сублімацыя скіраваная менавіта ў гэты бок. Бабкі-Ёжкі мне вельмі падабаюцца, я іх часта раблю — але ў мяне яны, канешне, ніяк не адмоўныя персанажы, нягледзячы на сваю рэпутацыю ў масавай свядомасці. Я адштурхоўваюся хутчэй ад вобраза старой, якая жыве асобна ад людзей, якая многае ведае і ўмее, вобраза Берагіні. Увогуле, я вывучаю фальклорныя крыніцы, і стараюся вылучаць тое, што ўласціва менавіта нашай беларускай традыцыі. Асабліва ў апошнія гады я захапілася гэтай тэмай, так і атрымалася цяперашняя выстава ў Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва. У нас жа на гэтым матэрыяле мала хто працуе, акрамя славутых ілюстрацый Валерыя Славука да двухтомніка "Беларускі фальклор" і не многае знойдзеш. Думаю я і пра тое, як наша беларуская міфалогія пераклікаецца з агульнаеўрапейскім фальклорам, і з сучасным светам фэнтэзі — тут вялікая прастора для творчасці. Мае лялькі з гэтай серыі — яны ўсе трошкі і тролі. А Бабкі-Ёжкі, канешне, самыя абаяльныя — насатыя, з вострым падбародкам. Як ні дзіўна, многія жанчыны кажуць, што яны ў старасці хочуць быць такімі ж бабкамі. Хоць я і раблю гэтых лялек вельмі рэалістычна, з усімі прыкметамі ўзросту.

— А як у вас з'явілася такое захапленне, як вы сталі мастаком па лялках?

— Я проста любіла ў іх іграцца, вельмі любіла Барбі, любіла іх апранаць, шыць нешта — аднойчы нават спрабавала пашыць сабе мяккую Барбі, каб з ёй можна было спаць. А аднойчы ў нас дома рассыпалася старая Снягурка пад ёлку, і я сама зрабіла новую. Так у старэйшых класах ліцэя і праявілася мая схільнасць. Калі прыйшоў час паступаць далей, я, мабыць, не знайшла для сябе адпаведнага аддзялення, і вырашыла пайсці на мастацтвазнаўцу ў Акадэмію мастацтваў. Неўзабаве перавялася на завочнае і стала працаваць у прыватнай кампаніі дызайнерам па сцэнічных касцюмах. І там паспрабавала стварыць адну ляльку, другую, яны ўсім спадабаліся. А як іх рабіць, вучылася практычна сама: гадоў 17 таму яшчэ не было такога патока інфармацыі, розных роліка ў інтэрнэце. Я да ўсяго даходзіла ўласным розумам, метадам спроб і памылак у літаральным сэнсе — напрыклад, да таго, што каб злепленая галава даволі вялікага памеру добра прапяклася і не трэснула, яе трэба набіць фольгай, і гэтак далей. Калі потым у Расіі выйшла кніга-падручнік Надзеі Генсіцкай, то аказалася, што я ўжо сама да ўсяго даўмелася.

— А ў прынцыпе, ёсць жа тэатральныя лялькі, ды й проста лялек людзі даўно робяць?

— Гэтыя лялькі адрозніваюцца ад тэатральных, яна ствараюцца па зусім іншых прынцыпах: у тэатры яны павінны рухацца, там маюць значэнне даволі буйныя планы, буйныя дэталі, іх робяць з іншых матэрыялаў. Калі згадаць мінулыя стагоддзі і тых дарагіх лялек, што ішлі на падарункі вялікім чынам і захоўваліся ў дамах як вялікія каштоўнасці — гэта былі менавіта лялькі, з якімі можна было іграцца, рухаць ручкамі-ножкамі, пераапранаць іх і гэтак далей. Зараз жа мы маем справу з нечым абсалютна іншым — тая лялька, якую раблю я, гэта як скульптура, як карціна, у якой цэлы сюжэт. Можа, нават варта ўжо прыдумаць нейкі іншы тэрмін, новае слова для больш дакладнага азначэння. Увогуле, я адчуваю, што прынамсі ў Беларусі не хапае добрай мастацкай крытыкі, мастацтвазнаўцаў, якія б адпаведна ацэньвалі творы. Бо ў нашым асяроддзі лічыцца нармальным скрасці чужую ідэю, скапіраваць вобраз, зрабіць халтуру — ніхто ж цябе не пакрытыкуе, не ацэніць з мастацкага пункта гледжання, не расставіць усё па належных паліцах, не падштурхне да развіцця.

— Але ж вы і мастацтвазнаўца...

— Трэба выбіраць нешта адно — ці рабіць, ці ацэньваць. Прызнаюся, я сама не да канца разбіраюся ў логіцы працэсу, не разумею, чаму людзі купляюць маіх лялек, чаму падчас гатовыя плаціць вялікія грошы. Мне ж потым такія водгукі прыходзяць, людзі такія лісты пішуць! Каму мая лялька выратавала жыццё, каго ў складаны перыяд выцягнула з дэпрэсіі... А нехта, калі ў сям'і праблемы, трэ чаравічок Бабкі-Ёжкі, і верыць, што гэта дапамагае. (смех) Людзі ставяцца да лялек як да талісманаў, абярэгаў, даюць лялькам імёны, хаця сама я так не раблю. Самых розных гісторый многа, але ўсе яны станоўчыя. Нехта прызнаецца, што баяўся раней лялек у доме — маўляў, яны могуць ноччу расплюшчыць вочы і загаварыць, а вось з вашымі наадварот спакойна. Я раблю анёльчыкаў — зараз у мяне такія беларускія анёльчыкі, з беларускім арнаментам — дык многія знаходзяць у іх падабенства са сваімі дзеткамі. Мае лялечныя вобразы, такім чынам, трапляюць у нейкія патаемныя месцы душы людзей. Стаўленне да лялек зусім іншае, не такое, як, напрыклад, да карцін ці проста статуэтак — з лялькамі ў людзей значна больш блізкая сувязь.

К

Як і многія мае суайчыннікі ў свой законны працоўны адпачынак мы з жонкай імкнемся наведаць экзатычныя мясціны з ліку тых, што на ўзбярэжжы якога-небудзь мора. Пажадана цёплага. Былі ў Балгарыі, Чарнагорыі, Каталоніі, на Сіцыліі. Менавіта праз параўнанне са згаданым замежжам пераканаўся, што Беларусь — цудоўная краіна. Зразумела, мора было б нам не лішнім, бо відавочна вабіць беларусаў вялікая вада. Але сёлета здарылася неспадзяванка…

Зацемкі на палях карты вандровак у дні кароткага сямейнага адпачынку



“Трэба дома бываць часцей…”

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота аўтара

Пандэмія, самаізаляцыя, закрытыя межы… Але не бывае так у жыцці, каб кепскае ды на нешта добрае не вывела. Сітуацыя, што склалася, падвяла да думкі, што вядомая барадулінская тэза “Трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем”, пэўным чынам датычыць не толькі вяскоўцаў, што, атабарыўшыся ў горадзе, забыліся на родную хату, але і нас, карэнных гараджан. Я нарадзіўся ў Мінску, жонка — у Гродне. Жывем у прыгарадзе сталіцы і за Мінскую акружную выбіраемся амаль выключна ў камандзіроўкі. Так што свой вялікі дом — Беларусь, хоць і ведаем, але ўсё ж недасканала. Вырашылі гэту хібу выправіць.

Парадай нам дапамог сусед па лецішчы Уладзімір Цвірка, які склаў не адзін дзясятак турыстычных маршрутаў па Беларусі на ўсе густы. Пра яго, дарэчы, і наша газета пісала. Штогод мы абавязкова выпраўляемся ў Гродна. Звычайна на некалькі дзён. Там у жонкі сваякі, сябры, аднакласнікі, аднакурснікі. А для мяне такая паездка нагода яшчэ пабачыць цудоўны горад і з прыемнасці адзначыць, што Гродна ўсё прыгажэе і ў сваёй эстэтычнай выразнасці ўжо складае сур’ёзную канкурэнцыю прыбалтыйскім сталіцам, якімі мы так захапляліся за савецкім часам.

Вось і гэтым разам вырашылі ехаць знаёмай дарогай, але пры гэтым маршрут ускладніць, з’язджаючы ўбок ад трасы па цікавосткі. Потым некалькі дзён гасціць у Гродне і назад у Мінск праз Гарадзеншчыну і Берасцейшчыну. Атрымалі ў спадара Уладзіміра інфармацыю пра славутасці, якія варта пабачыць, і гасцініцы, дзе лепей спыняцца на начлег.

Праграма-мінімум выглядала так: палац Сапегаў у Ружанах, палац Пуслоўскіх у Косава, тры абарончыя царквы — Сынкавічы, Мураванка, Ішкальдзь. Гэта асноўныя кропкі, маршрут жа мусіў быць пабудаваны так, каб пабачыць нешта цікавае і на шляху паміж згаданымі аб’ектамі. Наш план не быў дагматычным, прадугледжваў імправізацыі, магчымасць перабудовы маршруту ў адпаведнасці са зменай настрою. Адразу ўдакладню, што рэалізаваць такую ідэю можна было, прынамсі нам, толькі пры наяўнасці ўласнага самахода з навігатарам. Хаця б таму, што дарога ў грамадскім транспарце стоміць так, што сапсуе і ўражанне ад шэдэўраў архітэктуры і несапсаванай прыроды. Акрамя таго да некаторых помнікаў дойлідства, як высветлілася, не даедзеш ні на аўтобусе, ні на электрычцы.

Доўжылася наша вандроўка з 27 чэрвеня па 2 ліпеня. Больш-менш падрабязна распавяду пра тое, што мы пабачылі, у наступным нумары, а пакуль пра вандроўку — у агульных рысах. 27-га выехалі на Гродна, увечары былі на месцы. Па дарозе наведалі Іўе, Мураванку, Скідзель. 28 — 29 гасцілі ў сваякоў. 30 чэрвеня выехалі на Мінск. Гэтым днём пабачылі Індуру, Ваўкавыск, Зельву, Сынкавічы, Ружаны. Заначавалі ў Пружанах, бо менавіта тамашнюю гасцініцу нам параіў спадар Уладзімір. Наступным днём, 1 ліпеня, агледзелі Пружаны і накіраваліся да Бярозы, адтуль — на Косава, далей — у Іваўцэвічы. Там заначавалі. 2 ліпеня наш маршрут пралягаў праз Баранавічы, Ішкальдзь, Новы Свержань. Увечары былі ў Мінску. У розных кропках інфармацыйная, культурніцкая і эмацыйная насычанасць была рознай. Недзе ў наяўнасці толькі аб’ект, але — шэдэўральны. Недзе дзве — тры цікавосткі, скажам так, рознай класнасці, аднак вартыя таго, каб дзеля іх выпраўляцца ў няблізкі шлях. Асобная гаворка пра Гродна. Гэта суцэльны горад-музей. Ды і проста пабачыць невядомую дагэтуль для цябе Беларусь нават з акна самахода на добрай хуткасці — рэч карысная.

Мы з жонкай яшчэ і дагэтуль асэнсоўваем пабачанае, разглядаем здымкі, зробленыя мабільнікам, згадваем фантастычнай прыгажосці палацы, замкі, касцёлы, цэрквы. Здаецца, ведаем сваю краіну, бо тут нарадзіліся, тут жывем — а вось за нейкі тыдзень нібыта адкрылі яе наноў. Паглядзіце на здымкі і пагадзіцеся з намі і Рыгорам Барадуліным — “Трэба дома бываць часцей…”

К



На здымках: фрагменты фотадзённіка вандроўкі.

КУЛЬТУРА WWW.KIMPRESS.BY № 28 / 11 ЛІПЕНЯ 2020 г.
Бамонд: опера, балет 9

Прэм'ера спектакля "Вілісы. Фатум прызначана нашым Вялікім тэатрам на 11 верасня. Але перад сыходам у адпачынак пастаноўка была прадэманстравана мастацкаму савету.

Адкрыццё на мяжы рэалізму і фэнтэзі

Надзея БУНЦЭВІЧ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Убачанае, пачутае і асэнсаванае сталі тройчы адкрыццём. Па-першае, невядомай у нас ранняй оперы Джакама Пучыні. Па-другое, новага рэжысёрскага імя — Аксаны Волкавай, якую дагэтуль мы ўспрымалі толькі як нашу сусветна знакамітую оперную салістку. Нарэшце, па-трэцяе, новых для нас тэндэнцый у оперный сцэнаграфіі, дзе яркая канцэпцыя, скрозь прасякнутая сімволікай, спалучаецца з відовішчасцю, зменлівасцю, развіццём і чытаецца без аніякіх папярэдніх тлумачэнняў (міжволі ўзнікаюць паралелі з колішнім мастаком Яўгенам Лысікам, які ў балетах Валянціна Елізар'ева рабіў тое ж, хіба ў іншых тэхналогіях).

УБАЧАНАЕ

Падбіраючы пастаноўчую каманду для сваёй дыпломнай працы, Аксана Волкава, на той час яшчэ студэнтка Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі па класе рэжысуры прафесара Маргарыты Ізворскай-Елізар'евай, спыніла свой выбар на папраўдзе зорнай замежнай мастачцы. Этэль Іёшпа родам з Санкт-Пецярбургу, у 2008-м скончыла ГИТИС, тры гады тому стала лаўрэатам найпрэстыжнай Расійскай нацыянальнай тэатральнай прэміі "Залатая маска", прычым менавіта ў намінацыі музычнага тэатра — за "Саламею" ў маскоўскай "Новай оперы". Яна ж паклікала не менш зорнага расійскага мастака па святле і відэакантэнту — Стаса Свістуновіча, яшчэ аднаго лаўрэата "Залатой маскі", праўда, за іншы спектакль два гады таму — "Губернатар" у ВДТ імя Г.Таўстаногава з Санкт-Пецярбурга. І хаця святло і відэа нашых "Вілісаў" яшчэ будуць удасканальвацца (перашкодзілі пандэмія, бо працаваць на адлегласці — не заўсёды зручна), спектакль ураджае сваёй канцэпцыйнасцю нават у цяперашнім выглядзе.

Здолеўшы зацікавіць мастакоў і тэатр, рэжысёр не памылілася, хаця кожная новая праца нават вельмі таленавітага і дасведчанага майстра — заўжды крок у невядомае. А тут яшчэ — і ў прастору містыкі, бо ў сюжэце выкарыстана страдаўняе падданне: маўляў, дзяўчаты, загінуўшы напярэдадні вяселля, што так і не адбылося па віне жаніха, ператвараюцца ў лясных духаў — вілісаў — і "затанцоўваюць" да смерці сваіх крыўдзіцеляў. Пазналі балет "Жызэль"? Правільна, бо ён таксама створаны паводле той жа легенды, распаўсюджанай у многіх народаў у розных варыянтах.

У нас, напрыклад, ёсць русалкі, і падсвядомыя "спасылкі" на іх у сцэнаграфіі так ці іначай прысутнічаюць. Бо дзеянне перанесена з цёмнага лесу на бераг возера, дзе Ганна ў дзяцінстве, бы тая Асоль з "Пунсовых ветразяў", разам з татам Гульельма (Уладзімір Пятроў) пускае карабельчык, а побач лунаюць-мітусяцца анёлікі-матылькі. Пазней на прыстані яна праважае жаніха, які едзе атрымаць спадчыну ад памерлай сваячкі. Водная роўнядзь ператворыцца ў сістэму люстэркаў, у кроплі-слёзы даждж-непагадзі, у шчыты ваяўнічых дзяўчат-амазонак — нарэшце, у адкрытую магілу.

У складзенай сістэме вобразных каардынат нават такія, здавалася б, зашмальцаваныя рэчы, як арэлі і доўгі шлейф поліэтылену, успрымаюцца вельмі дарэчы, яшчэ і як дадатковыя намёкі на ўзнёслую рамантыку 1970-х і жорсткае "чарнобле" 1990-х. Чорна-белая палітра з пераважай чорнага ўзбагачана піяшчотнай акварэллю дзяцінства-юнацтва Ганны, "золатам" разлучніцы Сірэны, якое побач з чорным становішча трывожным колерам трагедыі.

Узнікаюць і прамыя спасылкі на масавую культуру, чыю мову большасць гледачоў прывучана чытаць куды лепей за ўласна тэатральную і тым больш оперную. Гэта і раскошная блакітная сукенка гераіні ў стылі казачных галівудскіх прынцэс, і падкрэслена аголеныя ногі, што растуць ад шыі, у Сірэны (Вольга Гайко), і наўмысна разбэшчаны, як таго патрабуе задума, канкан не сяброўак (балетмайстар — Канстанцін Кузняцоў).

Відовішча літаральна мігціць сваёй амбівалентнасцю: блізкае да ўлюбёных шырокай публікай шоу, яно ўтрымлівае не толькі сімволіку згаданых пераўвасабленняў, але і тонкую паэтыку, што вымушае не абмяжоўвацца адзінным праглядам і абавязкова вярнуцца да спектаклю зноў.

ПАЧУТАЕ

"Вілісы" — першая опера Дж.Пучыні, напісаная для конкурсу, да якога яна, дарэчы, так і не была дапушчана. Італьянскія даследчыкі лічаць, што журы папросту адмовілася разбіраць "іерогліфы" дрэннага почырку аўтара: у 1883 годзе, зразумела, пра цяперашні камп'ютарны набор нават марыць было дарэмна. Стартавай пляцоўкай далейшай "раскруткі" гэтага твора стала яго прыватнае праслухоўванне ў доме міланскага мецэната, куды былі запрошаны ўплывовыя асобы. Музыка ўразіла — і праз некалькі месяцаў атрымала пастаховае сцэнічнае ўвасабленне. Потым опера рэдагавалася, выдавалася, ставілася ўжо ў новай версіі, якая і прызнана канчатковай.

Эх, не ведаў кампазітар, што ў Беларусі будзе прапанавана чарговая рэдакцыя — з дададзенай іншай музыкай яго самога ж. Для сцэны Сірэны, адсутнай у Пучыні, была абрана яго квартэтная мініяцюра "Хрызантэмы". Але па-новаму інтэрпрэтаванай аказалася не толькі гэта музыка, але і ўся партытура.

Дырыжор Іван Касцяхін, разумеючы некаторыя аркестравыя няроўнасці першай операй спробы 25-гадовага на той час аўтара, наблізіў музыку да яго сталага стылю. Нічога не змяняючы ў нотным тэксце, дамогся гэтага праз некаторыя тэмпавыя зрухі, іншы эмацыйны стан, характар гучання. Адныя інструментальныя лініі сцішыў, іншыя — наадварот, вывеў на першы план. Магчыма, гэта здзейсніў бы і сам аўтар, калі б вярнуўся да "Вілісаў" на схіле гадоў.

На кожную з трох оперных партый заяўлена, мяркуючы па праграмцы, ад трох да пяці салістаў. Іх параўнанне — справа будучыні. Але ўсе, хто назіраў за рэпетыцыйным працэсам, у адзін голас гаварылі пра тое, як старанна, скурпулёзна працавала малады рэжысёр адначасова з чатырма складамі (звычайна пастаноўшчык абмяжоўваецца адным — двума, астатнія далучаюцца пазней), як падказвала нават вакальныя сакрэты, апекавала кожнага з салістаў, большасць якіх — пачаткоўцы.

Той жа тэнар Тарас Прысяжнюк — прадстаўнік украінскай вакальнай школы, удзельнік Маладзёжнай оперный праграмы Вялікага тэатра Расіі, склаў прыгожую сямейную пару з нашай Мартай Данусевіч і прыехаў следам за ёй у наш тэатр, адразу патрапіўшы ў гэту пастаноўку. Дагэтуль ён меў, у асноўным, канцэртныя выступленні, але ў ролі Рабэрта (ды яшчэ побач з жонкай у аблічы Ганны) пачувае сябе цалкам спрактыкаваным артыстам. У той жа патыні заняты і Іван Бярэзін, які скончыў першы курс нашай Акадэміі музыкі. Ужо адно тое, што малады рэжысёр не баіцца звяртацца да пачаткоўцаў і раскрывае іх спеўна-акцёрскія здольнасці, абапіраючыся, у тым ліку, і на свой багаты сцэнічны вопыт, дарагога каштуе.

АСЭНСАВАНАЕ

Спектакль пабудаваны як свядомае разбурэнне стэрэатыпаў і тым больш банальнасцяў. Рэалістычныя сцэны "вясковых радасцей" вырашаны сімвалічна, без традыцыйных пярэстых убранняў і скокаў. Сцэна ж у Сірэны замест нейкіх міфічных істот выводзіць на подыум рэальных дзяўчын з начных клубаў, бараў, казіно, якія "дапамагаюць" наведвальнікам расставацца з грашыма. У рэальнасць пераводзіцца і рамантызаваная смерць гераіні "ад кахання". Перад расстаннем вялізны вэлюм Ганны шлюбным ложам кладзецца долу, а смерць наступае ад няўдалых родаў, пра што сведчаць далей і скрутак-немаўля, які становіцца эфемерным, і дзіцячая выява побач з духам Ганны ў люстэрках: жыццёвыя нягоды, як вядома, не ідуць цяжарным на карысць. Дый вілісы зусім не "затанцоўваюць" сваю ахвяру: яны павольна-нямудрыя рухаюцца на Рабэрта, абкружаючы сцэнной шчытоў-люстэркаў.

Падманвае і слова "фатум", дададзенае ў назву оперы. Смерць Рабэрта становіцца ў спектаклі вынікам не містыкі, а пакутаў сумлення, што прачнулася ў героя, калі ён уцямяў, што змарнаваў не толькі грошы, а ўсё жыццё. Фатум перакладаецца як "кропка невяртання", немагчымасць "перайграць" няверны ход, зрабіць дубль, як гэта адбываецца ў віртуальных гульнях.

Шмат цікавага знойдуць і знаўцы музычнай класікі. Бо замест оперы-балета, як звычайна вырашаецца гэты спектакль, улічваючы значнасць сімфанічных фрагментаў, атрымліваецца менавіта опера. І опера акурат па-італьянску, калі запланаваныя кампазітарам сцэны балявання ставяцца без танцаў. Але адначасова — і па-французску таксама, пра што сведчыць устаўны балетны нумар. А яшчэ — з адценнем меладрамы ў яе першасным разуменні: як размоўных сцэн на фоне музыкі. Цікава, што той размоўны складнік "ад аўтара", у арыгінале неабходны для разумення сюжэта, тут становіцца толькі дадатковай гукавай фарбай-віньеткай. Бо замест цалкам перадаецца тэатральна-візуальнымі сродкамі: пра дзяцінства Ганны распавядае пластычная сцэна з згаданым карабельчыкам і арэлямі, пра Сірэну — балетная.

Спасылкі на творчасць Р.Вагнера, выплумачальныя ў маладога Дж.Пучыні, візуальна падмацаваны і адначасова парушаны іх пераасэнсаваннем. Прыцягальна аб'ёмны пейзаж у сцэне дзяцінства нагадвае ўваход у "грот Венеры" з вагнераўскага "Тангейзера". Але тая ж Сірэна аказваецца зусім не томна-спакушальнай Венерай.

Такая ж пераасэнсаваная сувязь аўдыё- і відэаскладнікаў ёсць і ў іншых дэталях. Музычная малітва ў фінале першай дзеі візуальна вырашана выхадам за межы быцця — як містычная сцэна з агеньчыкамі ўночы, што павінны духоўна падтрымаць герояў, дапамагчы ім не збіцца з жыццёвага шляху. А тая ж назва інструментальнай п'есы "Хрызантэма" абыграна ў графічных малюнках кранальна крохкіх кветак (гледзячы на іх, старэйшае пакаленне абавязкова згадае раманс пра адцвілыя хрызантэмы ў садзе), быццам звязваючы паміж сабой чаканне Ганны і здраду Рабэрта.

Спектакль атрымаўся шматслойным, па-еўрапейску стыльным, сучасным, метафарычным. Ён пераводзіць оперу з жанру, дзе дастаткова эстэтычнага задавальнення, ва ўлонне актуальнай этычнай, сацыяльна-гендэрнай праблематыкі. Вымушае не проста прыняць вечныя каштоўнасці апрыёры, таму што "так трэба", а спярша задумацца, паставіць сябе на месца герояў — і рабіць чарговыя жыццёвыя крокі цалкам усвядомлена.

Сцэны са спектакля.

Драматычныя рэаліі Гюнта

Да вераснёўскага адкрыцця свайго чарговага сезона Вялікі тэатр Беларусі гатовы, як ніколі: здача балета "Пер Гюнт", прэм'ерай якога сезон і пачнецца, адбылася ў канцы чэрвеня.

Надзея БУНЦЭВІЧ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Назва "Пер Гюнт", вытворная ад імя галоўнага героя, добра знаёмая літаральна кожнаму дзіяўці па вельмі "раскручанай" музыцы Эдварда Грыга, створанай да аднаіменнай драмы Генрыка Ібсена. Абапіраючыся на тыя дзіцячыя ўспаміны, многія і надалей працягваюць думаць, што гэта штосьці накшталт казкі пра фантастычныя падарожжы з захапляльнымі скокамі ў пячоры горнага караля. А між тым, гэта п'еса больш як 150-гадовай даўніны, жанрава азначаная аўтарам як драматычная паэма і напісаная ў вершах, сваёй філасофскай глыбінёй шмат у чым блізкая да гётэўскага "Фаўста".

Натуральна, што ў падручніках па музычнай літаратуры сюжэтную канву сюіты рабілі варыяцыяй на тэму: дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся. Насамрэч, у драме шмат сімволікі, горкай, часам нават з'едлівай іроніі, зусім не ўласцівых музыцы да яе.

Малады харэограф Сяргей Мікель пайшоў не за Грыгам з яго асобнымі лірыка-жанравымі сцэнамі, а менавіта за Ібсенам, актуальнасць драматургіі якога сёння толькі ўзрастае: нагадаем нядаўнія пастаноўкі Саўлюсам Варнасам яго п'ес "Жанчына з мора", "Калі мы, мёртвыя, абуджаемся" ў Магілёве і Гродна, берлінскі спектакль "Вораг народа", прывезены на сталічны фестываль TeART. Таму С.Мікелю можна падзякаваць ужо за адзін гэты крок насустрач філасофскай аснове драмы. Харэограф сам абраў гэту п'есу, вельмі сур'ёзна падышоў да лібрэта, чытаў і перачытваў Ібсена ў розных варыянтах перакладу, склаў з асобных цытат змест кожнай сцэны — у выглядзе Пралога, Пачатку і дзевяці "праектаў", падзеленых на дзве дзеі.

Не менш ураджае сур'ёзнае стаўленне дырыжора Аляксандра Анісімава, які выступіў таксама аўтарам музычнай рэдакцыі: да ўласна "Пер Гюнта" былі дададзены шматлікія іншыя партытуры Грыга, паміж імі была адбудавана адзіная стылёвая лінія — акадэмічна вытрыманая, даволі строгая, ураўнаважаная, пазбаўленая пярэстасці.

У спектаклі шмат цікавых ідэй, выкліканых як удумлівым паглыбленнем у літаратурную крыніцу, так і разуменнем асаблівасцяў менавіта музычнага тэатра. Цэнтральнай становіща ідэя чароўнага люстэрка, падобнага да партала ці жывой субстанцыі накшталт Салярыса (мастак па камп'ютарнай графіцы — Алена Ахрэменка). Актуальная ў сучасных стужках фэнтэзі, у спектаклі яна пазычана са скарыстанай у п'есе скандынаўскай казкі: калі алень з паляўнічым на спіне кідаецца з горнай вяршыні ў возера, аблічы чалавека і жывёлы адбіваюцца ў вадзе ў іншым часавым вымярэнні. Такое "падарожжа па часе" цягне за сабой жаданне спалучыць розныя харэаграфічныя пласты — ад ранняга рамантызму з яго сэнсава замаскаванай пантамімай, што пазней уваскрэсла ў харэадраме сацыялістычнага рэалізму, — да народнага танца 1950-х, эстраднага 1970-х — да таго падобнае. Удалым уяўляецца прыём "пачатку з канца", калі Пер (малады — Эвэн Капітэн, сівавалосы — Яўген Ядлоўскі) сутыкаецца з пераплаўшчыкам душ Гузікнікам (Такатошы Мачыяма) не ў фінале, а ў першай сцэне аповеду. І пачынае пракручваць сваё жыццё ў пошуках "сябе сапраўднага".

У параўнанні з п'есай, Гюнтава маці Азэ (Ірына Яромкіна) не збяднелая сялянка, а ўладальніца пераасоўнага тэатра. Сярод яго артыстак — Інгрыд (Ксенія Ржэўская), оперныя салісткі. Гэта дае пастаноўшчыкам біспройстрышную магчымасць звярнуцца да "спектаклю ў спектаклі" і ўвогуле спалучыць балет з операй. У адрозненне ад п'есы, Гузікніка тут суправаджае суцэльная світа Крывых (Лізавета Венска, Марыя Ландыр, Дар'я Тамаровіч). І ў гэтай жаночай тройцы бачыцца спасылка да знакамітых шэкспіраўскіх вядзьмарак. Анітра (Яна Штангей) пераасэнсавана з дачкі важака бедуінаў у іх прагную да золата правадырку.

З уласна балетных разыначак прыцягвае канцэпцыйнае асэнсаванне пуантаў. Балетмайстар ставіць на іх адмоўных герояў "іншага светавымярэння". Сярод іх — згаданыя Крывыя, надзеленыя вуглавата-зламанай, сучасна-"падлеткавай" пластыкай, што кантрастуе мяккасці, закругленасці рухаў рэальных персанажаў. На пуантах таксама "хісткія", дрыготкія пацыенты вар'яцкага дома. Але ў мастацтве заўжды вельмі важная не толькі сама па сабе наяўнасць ідэй, хай тыя і не прэтэндуюць на ноўхаў, а менавіта іх канкрэтнае ўвасабленне — зноў-такі, на мове мастацтва. На жаль, тут і пачынаюцца пэўныя праблемы.

Пластыка новага балета не вылучаецца знаходкамі, колькасць пантамімы проста зашкальвае. Магчыма, у нялёгкіх умовах пандэміі пастаноўшчык не хацеў надта нагружаць артыстаў, прапанаваўшы ім складаныя рухі. Але відовішча атрымалася амаль "небалетным" — дый на распаўсюджаны сёння жанр пластычнага спектакля ніяк не цягне.

Сцэны з жыхарамі пасёлка вырашаны ў жанры сялянскай ідыліі XVIII стагоддзя, хаця Ібсен, у адпаведнасці з рамантычнай эстэтыкай, супрацьпастаўляў даволі жорсткі натоўп і героя, не падобнага да іншых. Нягледзячы на мільгаценне "шляхавых нататак" Пера, дадзеных літаральна пункцірам, драматургія пакідае адчуванне млявасці. Бо інтэнсіўнасць развіцця ў часавых відах мастацтва наўпрост залежыць ад насычанасці выкарыстаных сродкаў выразнасці. Калі ж амаль увесь час пануюць безаблічныя "агульныя формы руху", дзе воку няма за што зачапіцца, акрамя сцэнаграфіі, складаецца ўражанне бясконца адноўкавай пустэльні і нават пустэчы.

Пры такім раскладзе панане нават выступленне перасоўнага тэатра, якое магло б быць яркім кантрастам — тым больш, што для гэтага ёсць добрыя сцэнаграфічныя перадумовы (мастак — Любоў Сідзельнікава). На сцэну выязджае размаляваны аўтобус. Праз некаторы час у ім расчыняюцца дзверы — бы створкі батлейкі, і адтуль выходзяць артысты. А ў наступнай сцэне трольу той аўтобус-тэатр становіцца падобны на вялізную плату з мікрасхемамі, камп'ютарную гульню з лабірынтамі, звілістыя ж трубы ў паветры красамоўна сведчаць про падземнае царства.

Прам'ерай балета пачнецца новы сезон.

У другой дзеі ўвагу звяртаеш і на ваяўнічa-металічную канструкцыю з лесвіцай, і, пазней, на пустыя рамы, абжытыя звар'яцелымі, на скрыні-шырмы, заселеныя бяздомнымі, але здольныя ператварыцца ў аблокі. Гэтыя дэталі антуражу, іх пераўвасабленні, багатыя на асацыятыўныя сувязі, даюць шырокі прастор пластычным фантазіям. Ды толькі тыя харэаграфічна-гімнастычныя залацінкі, што раз-пораз быццам бы нараджаюцца, не ўзрастаюць да магутнага залатога злітка, бо не пастяваюць атрымаць добрага развіцця і тут жа знікаюць, выклікаючы шкадаванне.

Падобную "лапікавасць" кінутых ідэй, полістылёвасць харэаграфічных спасылак пастаноўчыкі імкнуцца пераадолець аркестравай еднасцю. Ды пры ўсёй кранальнасці інструментальных сола, вывераванасці балансу і выразнасці асобных фрагментаў, музыка Грыга ў цяперашнім выкананні страчвае такую сваю рысу, як жанравасць. З-за гэтага блякнуць, губляюць свой імпэт самыя вядомыя мелодыі "Пер Гюнта".

Вядома, за больш як два месяцы да прэм'еры, нягледзячы на маючы адбыцца адпачынак, у спектаклі многае можа змяніцца. У верасні, трэба спадзявацца, знікнуць не толькі маскі, што пакуль на большасці артыстаў, але і некаторыя шурпатасці.

Пакуль жа — адной з галоўных вартасцей спектакля, дзеля чаго яго трэба было паставіць такім, як ён ёсць цяпер, з'яўляецца неадольнае жаданне пасля праглядзу перачытаць п'есу Ібсена нанова. І адкрыць у ёй не толькі нарвежскія і агульна-чалавечыя, але і беларускія рэаліі. Бо тады становіща зразумела, што Сольвейг (маладая — Людміла Уланцава, сівавалосая — Ганна Фокіна, спеўная — Алена Золава) не толькі выратаванне Пера, але і яго галоўная віна: у чаканні, пра якое ён яе так легкадумна папрасіў, самоце, пустэльніцтве мінула ўсё яе жыццё. Ці што лозунг трольу — быць самім сабой задаволеным, які драматург адрасаваў дзеячам нарвежскай нацыянальнай культуры, мае самае непасрэднае дачыненне і да нашай сітуацыі: і з беларускім мастацтвам, якое доўгі час, лічылася, было нельга параўноўваць з сусветным, бо ў нас выключна свае нацыянальныя рысы, і з цяперашнім спектаклем. Паверце, вельмі хочацца назваць яго сапраўднай мастацкай з'явай, нават гэткім прарывам у развіцці харэаграфіі, бы штосьці не атрымліваецца. Можа, зноў пандэмія вінаватая? Бо дала магчымасць наглядзецца ў Сеціве столькі замежных цікавостак, што ўяўленне пра тое, што насамрэч "наперадзе планеты ўсёй", не магло не парушыцца.

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 28 / 11 ЛІПЕНЯ 2020 г.

Безліч жыццёвых імгненняў

Шчасце ў маладосці ўяўляецца вечным, як і ўласнае жыццё. І неяк не даражыш гэтым багаццем. Сталы ж век — не для самападману. Чаруюць і абнадзейваюць выпадковыя імгненні: няўлоўны ўзмах крыла, адлюстраванне праменя ў дажджавой кроплі на тваёй шчацэ, смех немаўля летнім надвячоркам. Гэтыя бясконцыя імгненні знікаюць у часе і прасторы, але ў памяці жывуць вечна і, як ключыкі, адчыняюць нам шчодрыя куфэркі забытых шчаслівых эмоцый. Сённяшнія лісты яшчэ раз пераконваюць, што дбайнымі гаспадарамі згаданых эмоцый з'яўляюцца і нашы работнікі культуры, майстры народных рамёстваў.

Яўген РАГІН

Ніколі не сумняваўся ў тым, што выцінанкі ствараюцца з дзіцячых уражанняў ад прачытаных казак. Тады, пры чытанні, спрабаваў нарадзіцца майстар. З уласных фантазій, уражанняў ды мараў. Цяпер, калі ўменне стала ўпэўненым, мастак пачаў валадарыць эмоцыямі, і сваімі, і нашымі. Адсюль і прарастае цуд. Пра адзін з такіх напісала загадчык аддзела мастацкай творчасці Палаца мастацтваў **Бабруйска** Наталля Кулікова: *"На інтэрнэт-пляцоўках працавала віртуальная выстава "Мае ўлюбёныя работы" бабруйскай майстрыцы выцінанкі Луцыі Рудакоўскай. У свой час быў абвешчаны праект "7 дзён — 7 работ". Рамеснікам трэба было штодзённа выкладаць у сацсетку фотаздымак свайго твора. З 3 па 10 ліпеня Луцыя Казіміраўна прыняла эстафету і на асабістай старонцы падзялілася з аўдыторыяй сваімі выцінанкамі. Яна — педагог дадатковай адукацыі цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, а таксама — кіраўнік узорнай студыі выяўленчага мастацтва "Фантазія і Я". У выцінанцы яна - ас".* Вам не падаецца, што людзі, якія кіруюць узбагачэннем нашай дзіцячай фантазіі, закладваюць падмурак будучыні і без іх свету не абысціся?

Вернемся да імгненняў. Вось побач з італьянскім Неапалем ёсць знакаміты вулкан Везувій. Ён час ад часу пыхкае і заўжды гатовы справакаваць ці выкід попелу з лавой, ці землятрус. Таму дзвіз у Неапаля прыблізна такі: "Цані імгненне!" Вельмі канструктыўны падыход да жыцця: кожны яго дзень прыносіць шчасце. Наша задача — яго не праваронiць. Таму не спяшайцеся. Пастойце побач са сталым дубам, прыкіньце, колькі закаханых ён прытуліў на сваім вяку пад надзейнымі шатамі. Паслухайце, як жвава гамоніць лясны ручай, пра што даводзіць жаўрук над полем. Пакарміце качак на рацэ. Пачытайце кнігу, якую вам прапануе бібліятэкар. Згадайце юнацтва і свой родны горад...

Да слова, **Бабруйск** адсвяткаваў 633-ці дзень нараджэння. На падзею не мог не адрэагаваць мясцовы Палац мастацтваў. Метадыст культурна-масавага сектара ўстановы Ірына Аўсяннікава распавядае: *"Падзеі быў прысвечаны анлайн-канцэрт "Гэты горад — самы лепшы горад на зямлі!" 29 чэрвеня ў прамым эфіры выступілі заслужаныя аматарскія калектывы Рэспублікі Беларусь: народны хор народнай песні імя Віктара Балаханава і народны ансамбль танца "Юнацтва"; народны камерны хор; узорны музычны тэатр "Слугі трох муз"; салістка вакальнай студыі "Star Kids" Ксенія Аляксандрава".*

Сёння мы завяршаем, так бы мовіць, эпапею пра стварэнне габелена "Гісторыі жывая ніць", прысвечанага 75-й гадавіне Вялікай Перамогі. Аўтары — Алена Шунейка і яе вучаніца Юлія Барадзіна. Прэзентацыя работы адбылася 1 ліпеня ў **Гродзенскім** абласным метадычным цэнтры народнай творчасці.

На Дзень Моладзі не згадаў сваё юнацтва толькі той, хто не паспеў яшчэ пасталець. Ад сябе магу пажадаць такім толькі адно: "Не спяшайцеся!" Пра шэраг мерапрыемстваў клубных устаноў з нагоды Дня моладзі падрабязна з разбіўкай па раёнах паведаміла вядучы рэдактар **Магілёўскага** абласнога метадычнага цэнтра Крысціна Башарымава. *"Маладзёжную дыскатэку наладзілі на* **Кругляншчыне**, *арганізавалі таксама флэш-мобы, конкурсы і канцэрты.* **Кіраўск** *таксама парадаваў вечарам сучасных маладзёжных танцаў.* **Быхаў** *вызначыўся фэстам фарбаў. Стрыжку задарма прапанавала крэатыўная "Новая цырульня" ў* **Касцюковічах**. *Работнікі цэнтралізаванай клубнай сістэмы* **Глускага** *раёна правялі маштабныя вечары адпачынку ў* **Завалоцкім**, **Турынскім** *сельскіх Дамах культуры,* **Слаўкавіцкім** *СК."*

Фестываль маладзёжных субкультур прайшоў ля муроў **Лідскага** замка. Мясцовыя работнікі культуры сцвярджаюць, што гэтае мерапрыемства можна смела назваць святам творчасці і натхнення. Фэст — вынік калектыўнага намагання. Стварылі свята студыі сучаснага танца, танцавальна-спартыўны клуб, фаер-брыгада. За кожным імгненнем фэсту — шматдзённыя рэпетыцыі і бясконцыя хваляванні-радасці, з якіх і складаецца гісторыя ды культура нашай краіны.

Зажынкі — таксама яскравы адбітак культуры і гісторыі. Прайшлі яны ў полі ля вёскі **Істакі Лідскага** раёна. І галоўнымі дзейнымі асобамі былі тут не толькі хлебаробы, але і работнікі культуры.

Спадзяюся, што расповедаў пра канкрэтных работнікаў клубаў, бібліятэк, музеяў на старонках "К" паболее. Справа ў тым, што на **Віцебшчыне** па ініцыятыве абласнога метадычнага Цэнтра народнай творчасці і абласной арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму ладзіцца абласны конкурс на лепшую публікацыю ў СМІ пра работнікаў культуры. Паведаміў пра гэта Андрэй Струнчанка. *"Мэта акцыі, — удакладняе аўтар, — павышэнне прэстыжу і сацыяльнай значнасці работніка культуры, садзейнічанне прафесійнаму росту спецыялістаў, рэалізацыя іх творчых здольнасцяў, узаемадзеянне са СМІ".* Галоўнае, каб у будучых артыкулах не знікла цеплыня душы тых, пра якіх напішуць калегі.

Вы не спрабавалі праглядаць кнігі, якімі зачытваліся ў дзяцінстве? Яны, на дзіва, падаюцца трошкі прымітыўнымі. Я цяпер цудоўна разумею, што гэта не аўтарская віна, а аўтарская заслуга: пісьменнік наўмысна стварае толькі касцяк твора, усё астатняе дадумвае маленькі чытач, які, дзякуючы ўласнай фантазіі, становіцца суаўтарам кнігі. Так што я зноў пра фантазію. Дакладней не я, а бібліятэкары **Бераставіцкага** раёна. Яны паведамілі пра тое, што ў **Масалянскай** інтэграванай сельскай бібліятэцы для дзяцей быў арганізаваны дзень вясёлых забаў "Свет актыўнага дзяцінства". У той дзень рэй тут вяла менавіта фантазія, якую без кніг і чытання не ўзгадаваць.

Тэму развіваюць супрацоўнікі **Малабераставіцкай** бібліятэкі. Тут прыдумалі гульню-пошук "Кніжны лабірынт". Лабірынт — гэта стэлажы. На іх трэба знайсці кнігу, якая дапаможа адказаць на конкурснае пытанне.

Студэнты завочнікі жартуюць, маўляў, завочнае навучанне, як завочнае харчаванне. Жарт згадаўся, калі чытаў ліст ад метадыстаў **Свіслацкага** раёна. А пісалі яны пра брэндавую акцыю "Квашаныя бліны" ў аграгарадку **Ханявічы**. Наколькі я зразумеў, клубнікі падарылі вяскоўцам святочны настрой у выглядзе відэазапісу пра смакату бліночкаў. Мы нават і паху не адчулі.

Яшчэ адна навіна са **Свіслаччыны** — пра канцэртнае абслугоўванне маланаселеных і аддаленых вёсак. Апошнія гастролі артыстаў з райцэнтра адбыліся ў **Драчанах** і **Стоках**. Не сумняюся, што кожнае імгненне гэтых канцэртных праграм дзядулі і бабулі запомняць надоўга.

Пра наркаманію гаварылі ў чытальнай зале **Столінскай** цэнтральнай раённай бібліятэцы. Галоўны бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі Кацярына Страха паведаміла: *"Гаворка з чытачамі ішла пра здаровы лад жыцця. На мерапрыемстве прысутнічалі супрацоўнікі раённага аддзела ўнутраных спраў, прадстаўнікі камісіі па справах непаўналетніх Столінскага райвыканкама, святары".*

Апошняя на сёння навіна — з **Карэліцкага** раёна. Метадыст Карэліцкай раённай бібліятэкі Наталля Казарэз напісала пра патрыятычную акцыю "Вахта памяці", рэалізаваную з дапамогай аўтабібліятэкі. Яе маршрут пралёг па колішніх партызанскіх мясцінах — ад **Горнай Руты** да **Тударава**.

Вось такія імгненні толькі аднаго тыдня нашай рэгіянальнай культуры. І кожнае — вагой у век беларускай культуры і гісторыі. Вякі таму і мінаюць, што рухаюць іх імгненні.

Пішыце пра шчаслівыя імгненні!

Сустрэнемся праз тыдзень.

К

На здымках:
1 Габелен "Гісторыі жывая ніць" завершаны!
2 Маладзёжны фэст Ля муроў Лідскага замка.
3 Канцэрт у гонар дня нараджэння Бабруйска.
4 Луцыя Рудакоўская і яе выцінанкі.
5 Дзень моладзі святкуюць на Магілёўшчыне.

Як вядома, прафесійны рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры” — праводзіцца штогод сярод публічных бібліятэк краіны ў два этапы (абласны і рэспубліканскі). Сёлета ў рэспубліканскім этапе конкурсу прынялі ўдзел 35 бібліятэк.
14 мая ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў анлайн рэжыме былі падведзены вынікі XXVIII рэспубліканскага конкурсу за 2019 год. У склад журы ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаванай сістэмы публічных бібліятэк сталіцы, грамадскага аб’яднання “Беларускі фонд культуры”.
З дапамогай “воблачных” тэхналогій члены журы атрымалі магчымасць азнаёміцца з дасланымі матэрыяламі напярэдадні пасяджэння і пісьмовым галасаваннем вызначыць пераможцаў сярод бібліятэк, размешчаных у горадзе, і бібліятэк, размешчаных у пасёлках гарадскога тыпу, сельскіх населеных пунктах, адзначыць бібліятэкі да заахвочвання.
Пераможцамі сталі 22 публічныя ўстановы ў чатырох намінацыях: “За пошукавую і даследчую працу”, “За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем”,“За падтрымку і развіццё чытання”,“За навацыі ў сферы бібліятэчнай справы”. Дзесяць бібліятэк журы прадставіла да заахвочвання.

Журы конкурсу.

Парад крэатыўных кніжніц

Падведзены вынікі XXVIII рэспубліканскага конкурсу “Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры”

Адпаведна з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 93 ад 15 чэрвеня 2020 года “Аб выніках XXVIII рэспубліканскага конкурсу “Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры” бібліятэкі-пераможцы атрымаюць дыпломы першай, другой, трэцяй ступені і грашовыя прэміі ў памерах 50, 40 і 30 базавых велічынь адпаведна. Бібліятэкам, прадстаўленым журы да заахвочвання, выдаткаваны грашовыя прэміі ў памеры 10 базавых велічынь.

Найбольшая колькасць работ (11) была прадстаўлена ў намінацыі **“За пошукавую і даследчую працу”**.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАВЕДНІК І МАСТАЦКІ САЛОН

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана ***Гродзенскай*** *гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя Андрэя Макаёнка* за выданне бібліяграфічнага даведніка “Памяць горада Гродна ў манументальнай скульптуры”, адкрыццё для аддаленага карыстальніка электроннага інфармацыйнага рэсурсу “Манументальная памяць горада Гродна”. Рэсурс прадстаўляе цыкл з трох баз дадзеных “Ганаровыя грамадзяне”, “Кніга славы” і “Манументальная памяць”.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі адзначана ***Казлоўская*** *сельская бібліятэка* ***Светлагорскай*** *раённай сеткі бібліятэк* за рэалізацыю 12 праектаў краязнаўчага кірунку. Найбольш значныя з іх: брэнд-праект “Музей малой радзімы як увасабленне памяці пакаленняў”, сацыяльны праект “Парк памяці”, патрыятычны праект “#НіколіЗноў”, даследчыцкі праект “Зніклыя, але не забытыя”, краязнаўчы праект “10 імён Казлоўкі”, культурна-пазнавальны праект “Казлоўка. Кропка на карце” і гэтак далей. Вынікам вялікай даследчай працы бібліятэкі стала адкрыццё музея малой радзімы і помніка парычанам, загінулым у гады Вялікай Айчыннай вайны; выданне кніг “Блізкае далёкае: гісторыя населеных пунктаў Парыцкага сельскага Савета” і “Чырвонай кнігі Светлагорскага раёна”; стварэнне 10-ці ўласных электронных рэсурсаў, у ліку якіх “Летапіс аграгарадка”, “Гісторыя населеных пунктаў Парыцкага сельскага Савета”, “Землякі”, “Што ў прозвішчы тваім?” і іншае.

Другую прэмію сярод гарадскіх і раённых бібліятэк атрымала ***Ганцавіцкая*** *цэнтральная раённая бібліятэка імя Васіля Праскурава* за плённую пошукавую і даследчую працу па захаванні гістарычнай і культурнай спадчыны раёна праз рэалізацыю праекта “Вартыя памяці людской ...”

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, лепшай прызнана ***Сасноўская*** *сельская бібліятэка* ***Віцебскай*** *раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы* за імідж-праект “Радавод уладальнікаў зямлі сасноўскай”. Тут вывучаны радавод землеўладальнікаў Віцебскага краю Магучых і Шавярноўскіх, патомкі якіх пражываюць ў Расіі і Польшчы. Адшуканы прамы нашчадак роду ў 6-м пакаленні Андрэй Магучы — рэжысёр Санкт-Пецярбургскага драматычнага тэатра імя Георгія Таўстаногага.

Дыплом трэцяй ступені ў намінацыі “За пошукавую і даследчую працу” прысуджаны ***Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Аляксандра Герцэна*** *сеткі публічных бібліятэк* ***Гомеля*** за дзейнасць літаратурна-мастацкага салона “Сустрэчы на Замкавай”, які з’яўляецца цэнтрам зносін чытачоў і творчай інтэлігенцыі горада, месцам сустрэч аматараў літаратуры і гомельскіх пісьменнікаў, паэтаў, журналістаў. Знакавым для горада і яго жыхароў стаў інавацыйны праект “Музей аўтографа”, які працуе ў рэжыме мастацкай галерэі і дзе сабрана больш за 2000 аўтографаў выдатных сучаснікаў на афішах, плакатах, запрашальных білетах, канвертах, паштоўках, фатаграфіях, кнігах, дысках і іншых прадметах. Створана электронная паўнатэкставая база дадзеных “Віртуальны музей аўтографа”.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк стала ***Лунінская*** *сельская бібліятэка* ***Лунінецкай*** *раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы* за плённую пошукавую дзейнасць па даследаванні і папулярызацыі матэрыялаў ураджэнца вескі Лунін — журналіста, пісьменніка і даследчыка Мікалая Елянеўскага (1948 — 2003). Вынікам пошукава-даследчыцкай дзейнасці бібліятэкі стала стварэнне адпаведнага электроннага рэсурсу. Па ініцыятыве Елянеўскага ў вёсцы Лунін пакладзены пачатак правядзення абласнога літаратурнага свята “Лунінская восень”, ажыццяўляўся пошук і вывучэнне ўнікальнай працы святара Платона Ціхановіча (1838 - 1922) “Беларуская граматыка” — першай беларускай граматыкі, у аснову якой пакладзена мова палешукоў.

У намінацыю **“За падтрымку і развіццё чытання”** бібліятэкамі было даслана 9 работ.

“БІБЛІЯКРОХА” І СВЯТА ПАЭЗІІ

Першую прэмію сярод гарадскіх і раённых бібліятэк атрымала ***Нясвіжская*** *цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы* за сістэматычную і мэтанакіраваную працу па далучэнні дзяцей і бацькоў да чытання і рэгулярнага наведвання бібліятэкі, прасоўванне лепшых узораў літаратуры ў сферу зацікаўленага чытання, адраджэнне традыцый сямейнага чытання праз рэалізацыю культурна-асветніцкага праекта “Бібліякроха”.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, лепшай адзначана ***Баранавіцкая*** *цэнтральная раённая бібліятэка імя Яна Чачота* за стварэнне лічбавай медыяпрасторы праз рэалізацыю двух бібліятэчных праектаў: “Вяртаем вялікія імёны” (2018 — 2019) па папулярызацыі жыцця і творчасці класіка беларуска-польскай літаратуры Адама Міцкевіча і “Адкрываем новыя імёны“ (2018 — 2019) па знаёмстве і прасоўванні твораў сучасных беларускіх аўтараў, у тым ліку аўтараў Баранавіцкага рэгіёна.

Другое месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк журы прысудзіла ***Слонімскай*** *раённай бібліятэцы імя Якуба Коласа* за інавацыйнае прасоўванне кнігі ў чытацкае асяроддзе, за музей беларускай кнігі, музейны пакой ураджэнца Слонімшчыны, доктара філалагічных навук, прафесара, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, паэта, пісьменніка, навукоўца і перакладчыка Алега Лойкі.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк стала ***Бабіцкая*** *сельская бібліятэка* ***Чачэрскай*** *цэнтральнай раённай бібліятэкі* за выхаванне пачуцця годнасці слаўнага мінулага роднага краю, паважлівых адносін да сваіх каранёў, культуры, традыцый і звычаяў, за праект “Бібліялужок”.

На трэцяе месца ў намінацыі “За падтрымку і развіццё чытання” намініравана ***Дрыбінская*** *дзіцячая бібліятэка-філіял* за вывучэнне і захаванне шапавальства, якое мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь, за вывучэнне “Катрушніцкага лемезеня”.

Трэцюю прэмію сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк журы прысудзіла ***Астрынскай*** *гарпасялковай бібліятэцы* ***Шчучынскай*** *раённай бібліятэкі імя Цёткі* за свята паэзіі, прымеркаванае да дня нараджэння беларускай паэтэсы Алаізы Пашкевіч (Цёткі). Мерапрыемства стала брэндавым і з кожным годам набывае новыя рысы, становіцца больш шырокім і напоўненым.

У намінацыю **“За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем”** на разгляд журы было прадстаўлена 8 работ.

ВАЛАНЦЁРЫ І ЛЯЛЕЧНЫ ТЭАТР

Першую прэмію сярод гарадскіх і раённых бібліятэк атрымала ***Лёзненская*** *цэнтральная раённая бібліятэка* за мэтавую праграму “Беларускія вёрсты перамогі. Лёзненскі радок” (2018 — 2019), за выдавецкую дзейнасць.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі стала *сельская бібліятэка аграгарадка* ***Кальчуны Ашмянскай*** *раённай бібліятэкі* за далучэнне моладзі да чытання і кнігі, а праз іх — да вытокаў нацыянальнай культуры і літаратуры. Пры рэалізацыі праграмы “Рабі дабро разам з намі” створана і паспяхова дзейнічае валанцёрская група — для абслугоўвання маленькіх наведвальнікаў, пажылых людзей і чытачоў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

На другое месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк вылучана ***Быхаўская*** *раённая дзіцячая бібліятэка* за праект “Лялячны тэатр сваімі рукамі”, пры рэалізацыі якога пры бібліятэцы арганізаваны лялечны гурток “Куклаград”; за метадычны дапаможнік — краязнаўчы лэпбук “Падарожжа па Быхаўшчыне”, размешчаны на сайце Быхаўскай ЦБС.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у намінацыі **“За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем”** было прадстаўлена толькі дзве работы, адна з якіх не набрала дастатковай колькасці балаў да ўзнагароджання.

У намінацыі **“За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы”** бібліятэкамі было даслана 7 работ.

ІНФАГРАФІКА І АДРОДЖАНАЕ РАМЯСТВО

На першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк намінавана ***Баранавіцкая ЦБС*** за крэатыўны падыход да папулярызацыі здабыткаў нацыянальнай літаратуры з дапамогай інфаграфікі, стымуляванне бібліятэчных спецыялістаў да павышэння прафесійнай кампетэнцыі шляхам арганізацыі і правядзення гарадскога конкурсу сярод бібліятэкараў “Папулярызацыя беларускай кнігі і чытання сродкамі інфаграфікі”.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, дыпломам першай ступені адзначана ***Поразаўская*** *бібліятэка-цэнтр краязнаўства* ***Свіслацкай*** *раённай бібліятэкі* за адраджэнне ганчарства, далучэнне дзяцей і падлеткаў гарадскога пасёлка Поразава да культурных каштоўнасцяў, рэалізацыю праекта па адкрыцці на базе бібліятэкі музейнага пакоя “Мастацтва гліны і агню”, за праект па далейшым развіцці музейнага пакоя “Адроджанае рамяство”.

Другая прэмія сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана ***Салігорскай*** *раённай цэнтральнай бібліятэцы* за тэкстыльны арт-праект “Мяккая Радзіма”.

Другое месца ў намінацыі **“За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы”** заняла ***Сялецкая*** *сельская бібліятэка-філіял* ***Бярозаўскай*** *раённай бібліятэчнай сістэмы* за стварэнне віртуальнай літаратурна-краязнаўчай гасцёўні “Вытокі Башты”.

Дыпломам трэцяй ступені сярод гарадскіх і раённых бібліятэк адзначана ***Смаргонская*** *раённая бібліятэка* за віртуальны інфармацыйна-пазнавальны праект “Смаргоншчына: ведай свой край”.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, на трэцюю прэмію журы вылучыла ***Грабянецкую*** *бібліятэку-клуб* ***Чэрвеньскай*** *цэнтральнай раённай бібліятэкі* за свята “Грабянецкі бульбафэст”.

Вольга КАКШЫНСКАЯ,
галоўны бібліятэкар навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Фота прадастаўлена бібліятэкай

Майстар-класы ад Акцябрскага РДР.

Не хлебам адзіным, або Цалкам сучасны падыход да піяру

Вядома, што адзін з прыярытэтных кірункаў развіцця сферы культуры любога раёна Беларусі — адкрыццё ўстаноў культуры новага тыпу: Дамоў рамёстваў, фальклору, народнай творчасці. Балазе, дзейнасць па захаванні народных традыцый — не менш важная за працу па паляпшэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры, бо, як кажа народная мудрасць, не хлебам адзіным жыве чалавек. А як жывуць сёння Дамы і Цэнтры рамёстваў Беларусі? Пра гэта паспрабавала даведацца "К".

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Супрацоўнікі Акцябрскага РДР на Дне вышыванкі ў Мінску.

КАСЦЮМ ДЛЯ МЕДЫКАЎ

Адна з цікавых высноваў тэлефанаванняў у рэгіёны датычыць, як гэта ні дзіўна, сённяшняй праблемнай сітуацыі з каранавірусам. Так, цягам апошняга часу многія раённыя Дамы і Цэнтры рамёстваў не толькі навучалі школьнікаў сакрэтам традыцыйных нацыянальных рамёстваў, але і прымалі самы чынны ўдзел у арганізаваных акцыях па шыцці масак і медыцынскіх спецыялізаваных касцюмаў для медыкаў. Словам, у тым, што эпідэміялагічная сітуацыя ў Беларусі змяняецца цяпер у значна лепшы бок, чым была раней, ёсць немалая заслуга і супрацоўнікаў айчынных РДР.

Напрыклад, менавіта пра падобную падтрымку медработнікаў мне расказалі ў раённым Доме рамёстваў і фальклору ў Гарадку, што на Віцебшчыне. Да слова, названая ўстанова існуе ў Гарадку з 1994 года, тут працуюць больш за дзясятак гурткоў традыцыйнага мастацтва, — як кажуць, на любы густ, — і выкладаюць высокакваліфікаваныя майстры. Але сёлетняя эпідэміялагічная сітуацыя прымусіла ўстанову крыху змяніць профіль.

— Цягам апошніх месяцаў мы шылі і маскі, і спецыяльныя касцюмы для нашых медыкаў, — кажа дырэктар Гарадоцкага РДРіФ Марына Гушча. — З дапамогай тых выкраек, якія нам перадалі, мы пашылі 10 касцюмаў і 50 масак для медыкаў бясплатна. Таксама шылі льняныя маскі на заказ — каля 500 штук.

Так што крэатыў мясцовых культработнікаў у выкананні плана платных паслуг — навідавоку. А яшчэ, каб зарабіць "капейчыну", падчас раённых святаў супрацоўнікамі ўстановы культуры ладзяцца аўкцыёны па продажы разнастайных прадметаў, платныя майстар-класы, а ў салоне-краме "Ля Парнаса", што працуе пры РДРіФ, вочы літаральна разбягаюцца ад шматлікіх вырабаў, выстаўленых на продаж.

— На ўсіх гарадскіх і раённых святах мы прадаём сваю прадукцыю кожнаму ахвотнаму, — кажа суразмоўца. — Іншая справа, што заробкі ад продажу сувеніраў не надта вялікія: на жаль, многія жыхары і госці Гарадка аддаюць перавагу кітайскай, а не нашай прадукцыі, зробленай з захаваннем нацыянальнага і мясцовага каларыту. Праўда, пазітыўныя тэндэнцыі ў гэтым кірунку ўсё ж ёсць і гэта не можа не радаваць.

Акрамя таго, супрацоўнікі Гарадоцкага РДР шыюць касцюмы для некаторых устаноў культуры, актыўна ўдзельнічаюць у раённым фэсце "Гарадоцкі Парнас", прысвечаным Канстанціну Вераніцыну — аўтару знакамітай паэмы "Тарас на Парнасе". Скажам, на гэтым мерапрыемстве жыхарам і гасцям Гарадка прапаноўваюць сфатаграфавацца ў народным адзенні, запрашаюць паглядзець батлейку, прадаюць стравы народнай кухні і сувеніры з эмблемай фестывалю. Праўда, сёлета свята з-за зразумелых прычын не адбылося, хоць якраз у гэтым годзе з часу напісання бессмяротнага твора прайшло роўна 165 гадоў.

Відэа-праект Ганцавіцкага РДР у адной з сацыяльных сетак.

— Натуральна, у мінулыя месяцы мы адчулі зніжэнне цікавасці да нашай установы з боку наведвальнікаў, — кажа Марына Гушча. — Праўда, экскурсіі ўсё адно ладзіліся невялікімі групамі ў некалькі чалавек, праводзіліся майстар-класы.

Акрамя таго, падчас зніжэння колькасці наведвальнікаў супрацоўнікі ўстановы культуры не адпачывалі, а працавалі над іншымі планавымі заданнямі. Напрыклад, распрацоўвалі буклеты па вырабе традыцыйнага, стылізаванага і вясельнага касцюмаў Гарадоцкага краю, паўдзельнічалі ў арт-сустрэчы "На крылах натхнення", дзе прадставілі гасцям займальны майстар-клас па набойцы, прынялі чынны ўдзел у конкурсах.

І апошняе. Не магу не згадаць, што сама Марына Гушча не так даўно атрымала Прэзідэнцкі грант на рэалізацыю праекта па развіцці тэхналогіі ажурнага ткацтва Гарадоцкага раёна, унесенага ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь (туды ж, дарэчы, днямі была ўнесена і яшчэ адна мясцовая традыцыя — спіральнае пляценне). Згодна з задачамі гранта, у раёне запланавана правядзенне выстаў і конкурсаў па ткацтве, адпаведныя майстар-класы, а яшчэ — закупка дадатковых ткацкіх станкоў і іншага абсталявання. Акрамя таго, на сёлетняй выніковай калегіі Міністэрства культуры Беларусі Марына Гушча была ўзнагароджаная нагрудным знакам "За ўклад і развіццё культуры Беларусі". Так што справы прапаганды рамёстваў і фальклору ў Гарадоцкім раёне знаходзяцца ў руках сапраўднага прафесіянала.

Гарадоцкі ДРіФ прэзентуе свае вырабы ў Міністэрстве культуры Беларусі.

Майстар-класы на Youtube ад Глыбоцкага РДР.

КОНКУРСЫ Ў РЭЖЫМЕ АНЛАЙН

Эпоха каранавіруса прымусіла таксама крыху змяніць традыцыйныя формы работы і ў Акцябрскім раённым Доме рамёстваў, што на Гомельшчыне. Як кажа дырэктар установы Таццяна Халадок, яны заўважылі змяншэнне колькасці сваіх наведвальнікаў яшчэ некалькі месяцаў таму.

— Сышлі ў інтэрнэт, дзе ў сацыяльных сетках прапаноўвалі сваім наведвальнікам паўдзельнічаць у конкурсах і праектах, — кажа Таццяна Халадок. — Таксама цяпер у нас працуюць летнія пляцоўкі, на якіх мы даем шанс усім паўдзельнічаць у пазнавальных конкурсах. А нядаўна вярнуліся з Мінска, дзе на "Дні вышыванкі" зладзілі выставу, на якой дэманстравалі тканыя ручнікі, паясы, тканы жаночы касцюм і сувенірныя лялькі ў нацыянальных строях ды многія іншыя рэчы.

Паўдзельнічалі супрацоўнікі Акцябрскага РДР, як і іншыя іх калегі, і ў аказанні дапамогі мясцовым медыкам падчас каранавіруса.

— Нам далі недзе два — тры заказы на пашыў медыцынскіх масак і нашы майстры з ахвотай уключыліся ў гэтую патрэбную і надзённую справу, — кажа кіраўнік установы культуры. — Такім чынам, агулам мы пашылі прыкладна 500 масак, якія былі вельмі запатрабаваны не толькі ў медыцынскіх установах, але і жыхарамі нашага гарадскога пасёлка.

Паспяхова працуе Акцябрскі РДР і ў справе прыцягнення дадатковага пазабюджэтнага фінансавання праз продаж сувенірнай прадукцыі.

— У нас ёсць невялікая салон-крама, дзе кожны наведвальнік можа набыць той або іншы выраб, зроблены нашымі майстрамі, — кажа Таццяна Халадок. — Акрамя таго, вывозім сувенірную прадукцыю на продаж, калі ўдзельнічаем у шматлікіх выставах і фестывалях па ўсёй Беларусі. Дадам, што менавіта продаж сувенірнай прадукцыі дапамагае нам сёння выконваць план платных паслуг.

Цягам апошніх месяцаў супрацоўнікі працягвалі метадычную дзейнасць, ствараючы буклеты і дапаможнікі па розных кірунках традыцыйнага мастацтва. А яшчэ на аснове сабранага і апрацаванага матэрыялу ў творчых майстэрнях сёння аднаўленыя або ствараюцца калекцыі тканых ручнікоў, плеценых паясоў, лялек-абярэгаў, народных саламяных і гліняных цацак ды многія іншыя.

МАЙСТАР-КЛАСЫ НА YOUTUBE

І ў іншых Дамах і Цэнтрах рамёстваў Беларусі праца ў новых фарматах ідзе поўнай хадой. Скажам, на YouTube-канале "Культура Глыбоччыны" можна сёння пабачыць майстар-класы супрацоўнікаў Глыбоцкага Дома рамёстваў. Так, майстар Юлія Арэхава распавядае пра сакрэты

саломкапляцення, а Алена Дабравольская прапануе павучыцца рабіць вырабы з бісеру. Да слова, на тым жа канале можна пабачыць ролікі, запісаныя як мясцовымі клубнымі супрацоўнікамі, так і бібліятэкарамі.

Яшчэ адзін YouTube-канал Цэнтра культуры і народнай творчасці Пастаўскага раёна запрашае ў мясцовы Дом рамёстваў з паэтычнай назвай "Стары млын". З дапамогай відэаролікаў кожны можа засвоіць сакрэты вырабу абрадавай лялькі "Зернавушка" або тое, як зрабіць гліняны званочак. А яшчэ тут можна віртуальна прайсціся з экскурсіяй па залах Дома рамёстваў ці ўбачыць сакрэты стварэння мясцовай стравы заходніх раёнаў Віцебшчыны "Клёцкі з душамі", традыцыя прыгатавання якой, да слова, унесена ў Спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Бачна нават па відэа: смакота неверагодная!

Акрамя таго, Дамы рамёстваў шчыруюць і ў сацыяльных сетках. Напрыклад, днямі Ганцавіцкі Дом рамёстваў на сваёй старонцы ў адной з сацыяльных сетак размясціў відэаролік з відэапраекта "З народнымі традыцыямі ў новы век", у якім дырэктар установы Ала Занька расказвае пра некаторыя нюансы сваёй дзейнасці. Акрамя таго, у гэтай жа ўстановы ў сацыяльнай сетцы ёсць і асобная старонка пад назвай "Этнакрама Дома рамёстваў. Ганцавічы" — своеасаблівая мясцовая віртуальная этна-вітрына з вырабамі мясцовых майстроў.

Як адзначаецца на згаданай інтэрнэт-старонцы, Дом рамёстваў прапануе шырокі выбар тканых і вышытых рэчаў (ручнікі, абрусы, сурвэткі, саматкаными ходнікі і палавікі, тканыя і вышытыя мужчынскія і жаночыя кашулі, майкі, спадніцы), рэчы для інтэр'ераў, сувенірныя вырабы, а таксама прымае замовы на выраб рэчаў па індывідуальным заказе. Што ж, цалкам сучасны падыход да піяру і "раскруткі" не толькі сваёй дзейнасці, але і па продажы сувенірнай прадукцыі. Думаю, не памылюся, калі скажу, што падобны інтэрнэт-крэатыў цягам наступных гадоў стане не "разыначкай", а звычайнай будзённасцю ўсіх айчынных Дамоў і Цэнтраў рамёстваў. Бо што ні гавары, а сяброўства з інтэрнэтам і сацыяльнымі сеткамі заўсёды ідзе на карысць установам культуры Беларусі, што, дарэчы, яшчэ раз яскрава пацвердзіла і сёлетняя неспрыяльная эпідэміялагічная сітуацыя.

К

Выкарыстаны фота з Сеціва

Пруток да прутка — і рукатворны шэдэўр нараджаецца літаральна на вачах. Па біяэнергетычных уласцівасцях лаза — з ліку раслін, якія аддаюць энергію. І гэта пацвярджаюць мае суразмоўцы — народныя ўмельцы Аляксандр і Людміла Мускія: "Калі пляцеш, пра ўсе балячкі забываеш, настрой падымаецца, адчуваеш неймаверны прыліў сіл".
Гледзячы на Мускіх, разумееш, што іх любімы занятак мае яшчэ адну цудадзейную сілу — ён моцна змацоўвае сям'ю. Нябачным, але вельмі трывалым і надзейным лазовым пруцікам.... Цяпер аматараў лозапляцення ў Беларусі шмат, але са званнем "Народны майстар Рэспублікі Беларусь", — адзінкі. У Гродзенскай вобласці — толькі Мускія са Смаргоні.

Майстры Людміла і Аляксандр Мускія.

Двухметровы капялюш для Смаргоні

Рамёства майстроў Мускіх

Іх работы: ровар-вазоніца, шляпа з лазы, якую Мускія падарылі гораду, калі святкавалі 500 гадоў Смаргоні. 2003 год.

ТАРА "НУМАР АДЗІН"

Лозапляценне адно з самых старажытных рамёстваў, якое дайшло да нашых дзён практычна без змен і ператварылася ў вытанчанае мастацтва. Яно зарадзілася раней за ткацтва, бо правобразам тканін былі сплеценыя з траў цыноўкі і першыя прадметы адзення.

У Беларусі з лазы рабілі розныя пабудовы, загарадзі, кузавы саней і павозак, нават рыбалоўныя сеткі і пасткі для птушак і жывёл, а таксама мэблю, дарожныя сакваяжы, посуд, кошыкі, дзіцячыя калыскі, цацкі... Многія рэчы з лазы засталіся ў мінулым, але, дзякуючы энтузіязму і таленту сучасных народных майстроў, адно з самых старадаўніх рамёстваў працягвае жыць.

Па-ранейшаму запатрабаваны ў садаводаў і агароднікаў беларускія кошыкі: бульбу садзіць-капаць, травы жывёле прынесці, яблыкі сабраць ці ў грыбы схадзіць. Для пікніка — гэта тара "нумар адзін". Прадукты харчавання ў іх надзейна абаронены ад дажджу і пылу, грыбы доўга не псуюцца з-за вялікай колькасці дубільных рэчываў, што ўтрымліваюць лазовыя галінкі. Больш далікатныя карзінкі, з ачышчанай лазы, — такімі гаспадыні і пафарсіць могуць. Чым не модны аксесуар?

Галоўныя вартасці плеценых вырабаў з лазы — экалагічнасць, зручнасць, лёгкасць, трываласць, практычнасць, характэрны прыемны пах і даўгавечнасць. Пры беражлівых адносінах яны не губляюць сваіх уласцівасцяў доўгі час. Аляксандр Мускі паказаў кошык, які яны захоўваюць як сямейную рэліквію. Дык вось яму ўжо больш за 60 гадоў.

ЛАЗУ ПЛЕСЦІ — НЕ БАЙКІ ВЕСЦІ

Лозапляценнем Мускія захапіліся ў 1994 годзе. Калі вярнуліся з Латвіі і прывезлі адтуль плеценую карзіну. Сястра Аляксандра спачатку зацікавілася гэтым рамяством і "заразіла" ім сваякоў. У Смаргоні на той час не было гуртка па лозапляценні. Азы рамяства Мускія спасцігалі самастойна — па дапаможніку, шляхам спроб і памылак, і пастаянных эксперыментаў.

Пляценне з лазы — занятак, падуладны людзям цярплівым і ўседлівым. Трэба патраціць нямала сіл і часу, каб падрыхтаваць пруткі да работы. На нарыхтоўку "сыравіны" Мускія ездзяць позняй восенню, калі кусты скінулі лісце і яшчэ не пачаўся рух соку ў расліне: лаза вышэйшай якасці — толькі з добра выспелай драўніны.

Потым пруткі неабходна як след выварыць, пакуль не пачне лёгка злазіць кара. Які водар стаіць у гэты час — ніякія хваробы не возьмуць пры такой ароматэрапіі! Існуе шмат відаў лазы, але Мускія аддаюць перавагу "лімоннай", якая пасля варкі набывае жаўтаваты колер.

Вывараную і пакараваную лазу сартуюць па даўжыні і таўшчыні і добра высушваюць. Для пляцення пруткі не ўсе прыдатныя: кожны трэба праверыць на ломкасць. Калі лаза нарыхтавана правільна, яна будзе вельмі доўга захоўвацца. У Мускіх ёсць нарыхтоўкі, якім ужо 20 гадоў, і яны прыдатныя для работы.

У дзень, калі збіраешся плясці, лазу трэба добра "прамачыць", каб яна набыла неабходную гнуткасць. "Вось калі пруткі гатовыя і сядаеш за работу, пачынаецца самы прыемны момант — стварэнне", — усміхаецца Людміла Анатольеўна.

20 ВІДАЎ

Што трэба, каб атрымаўся рукатворны шэдэўр? Зацікаўленасць, уседлівасць, акуратнасць і цярпенне, — пералічваюць майстры "складнікі поспеху". Калі дадаць сюды фантазію, асаблівы настрой і няспынны пошук у галіне формаў і дэкору, то творы пачынаюць набываць сваю адметнасць і непаўторнасць. Творчая жылка ў Мускіх працуе бясконца: адных толькі кошыкаў яны плятуць дваццаць відаў. І ўсе — нафантазіраваныя. Звычайна да Вялікадня прыдумляюць новую. Пакупніка трэба ўмець здзівіць. Адзіны элемент, які абавязкова прысутнічае ў вырабе, — акаймоўка касічкай. Гэта своеасаблівы аўтограф Мускіх. Не выкарыстоўваюць майстры і штучных фарбаў, не пакрываюць работы лакам. Для аздаблення могуць дадаць непакараваных пруткоў ці тых, якія больш паварыліся, — яны выглядаюць цямнейшымі.

ДОМІК ДЛЯ КАТА

Самабытнасцю і нацыянальным каларытам прываблівацюць рэчы, створаныя рукамі Аляксандра і Людмілы Мускіх. Пра гэта не раз выказваўся Яўген Сахута, першы ў Беларусі доктар мастацтвазнаўства ў галіне народнага мастацтва, прафесар, старшыня Беларускага саюза народнай творчасці.

Па-майстэрску створаныя работы карыстаюцца попытам у пакупнікоў не толькі ў Смаргоні - па ўсёй Беларусі. Ізраіль, ЗША, Італія, Германія, Польшча, Латвія, Літва, Расія — і гэта далёка не ўвесь пералік краін, куды "паехалі" работы смаргонскіх умельцаў.

Гартаю партфоліа майстроў Мускіх. Акрамя згаданых карзінак і кошыкаў, вазы рознай велічыні, домікі для катоў, куфры, паднос, хлебніца, рамка для люстэрка, пано, веласіпед-вазоніца... Аляксандр Андрэевіч дэманструе лазовы капялюш, але тут жа зазначае, што гэта рэч больш для прэзентацый, чым для паўсядзённага выкарыстання, не вельмі зручная. Дарэчы, у гісторыка-краязнаўчым музеі захоўваецца яшчэ адзін лазовы капялюш дыяметрам амаль у два метры, — памятны сувенір, які майстры Мускія падарылі гораду, калі адзначалася 500-годдзе Смаргоні.

У "рабочым графіку" народных умельцаў — пастаянныя ўдзелы ў розных фестывалях і кірмашах, конкурсах і майстар-класах. У бліжэйшых планах — фестываль "Александрыя збірае сяброў", на якім Мускія будуць не толькі прадаваць сваю прадукцыю, але і праводзіць майстар-клас.

Плятуць з лазы не толькі Аляксандр і Людміла, але і іх дзеці, зяць і нявестка, далучаюцца ўнукі. Старажытнае рамяство паступова перадаецца ў спадчыну

Галіна АНТОНАВА

Фота аўтара і з архіва гісторыка-краязнаўчага музея

На пляцоўцы пад старым вязам

Рамантык Ваньковіч праз прызму бачання сучаснага скульптара

Сто гадоў таму Велімір Хлебнікаў сказаў: "Задачай працы мастакоў было даць кожнаму віду прасторы асаблівы знак. Ён павінен быць простым і не быць падобным да іншых". Разумею, што тут гаворка ідзе пра рэформу знакавай сістэмы мовы. Але і ў дачыненні да выяўленчага мастацтва сутнасць не мяняецца. І мне здаецца, што творчасць знакамітага беларускага скульптара Уладзіміра Слабодчыкава цалкам адпавядае формуле выбітнага паэта-рэфарматара. Яго асаблівыя знакі - "свабода духу", "эстэтыка духу" — уключаюць у сябе не толькі ўласна свабоду мыслення, фантазіі, палёту ў нязведаныя сусветы далёкага і нядаўняга мінулага, але і свабоду стэка і пантографа, уменне віртуозна "жангліраваць" пластычнымі аб'ёмамі, складанай прасторай, лініяй, фактурай.

Фота з архіва Уладзіміра Слабодчыкава

Скульптурная кампазіцыя "Ранак мастака" ў Траецкім прадмесці Мінска.

В.Ваньковіч. Аўтапартрэт.

Слабодчыкаў упэўнены, што чалавек з яго гістарычнай памяццю існуе незалежна ад часу і прасторы ды можа вольна пераносіцца з аднаго вымярэння ў іншае, з адной эпохі ў другую. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, як настойліва мастак імкнецца ў сваёй творчасці знайсці той самы запаветны ключ, які раскрыў бы браму невядомага свету. У гэтым свеце смутак і роспач суседнічаюць з радасцю, адзінота — з імгненнямі шчасця, прадчуванне чалавечай трагедыі — з бестурботнай казкай дзяцінства, сацыяльныя расчараванні — з нараджэннем нацыянальнай самасвядомасці. У скульптурах Слабодчыкава ўспыхваюць і згасаюць надзеі, здабываецца шлях у бясконцы свет. Там ілюзіі — дзверы і сцежкі, заблытаныя лабірынты з адной замкнёнай сферы ў іншую. Там "верх" і "ніз", белае і чорнае, радасць і сум, асалода і боль. Але ў гэтай драме быцця - творчасць. Майстар нязменна адкрывае ў ёй чароўнае выйсце — люк, шчыліну, пробліск — заўсёды да Святла.

Пільнае вока можа прыкмеціць, што Слабодчыкаў у сваёй творчасці — хай гэта будуць станковыя партрэты, або помнікі ці мемарыяльныя знакі, або малая пластыка — нярэдка звяртаўся да аднаго і таго ж аднойчы ўпадабанага ім вобраза, канкрэтнага або абагульненага. Але ў розных яго версіях і выявах. Сярод такіх вобразаў, напрыклад, былі Максім Багдановіч і Уладзімір Караткевіч, Янка Купала і Станіслаў Манюшка, Стэфанія Станюта і Ларыса Александроўская, Уладзіслаў Галубок і Іван Навуменка, Алег Алоўнікаў і Гаўрыла Вашчанка, Феафан Грэк і Рагнеда, Францыск Скарына і Мікола Гусоўскі, а таксама Алексій II і Сямён Зорыч. Як правіла, гэта былі асобы, у той ці іншай меры сугучныя душы аўтара.

І асабліва месца ў гэтым пашанотным пераліку займае выдатны — ды, на жаль, доўгі час прызабыты — беларускі мастак першай паловы XIX стагоддзя Валенцій-Вільгельм Ваньковіч, чые 220-я ўгодкі не надта гучна адзначаліся сёлета ў маі. Многія сёння ўспрымаюць яго вобраз менавіта скрозь прызму бачання сучаснага скульптара. Што і нядзіўна: да адлюстравання гэтай постаці Уладзімір Слабодчыкаў звяртаўся не менш за пяць разоў, не лічачы шматлікіх гіпсавых эскізаў і мадэляў. Распавядзем пра гэтую працу падрабязна.

23 снежня 2010 года ў Мінску, на вуліцы Інтэрнацыянальнай, перад музеем "Дом Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX стагоддзя", які з'яўляецца філіялам Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, была ўрачыста адкрытая скульптурная кампазіцыя, прысвечаная мастаку-рамантыку. Суаўтарамі Уладзіміра Слабодчыкава выступілі архітэктары Юрый Казакоў і Ірына Дорахава. Гэтыя факты можна знайсці ў любой энцыклапедыі. Але мала хто ведае, што праца над творам — ад пачатку яго праектавання да ўстаноўкі — заняла больш за дзесяць гадоў! Тэрмін даволі працяглы, і на тое былі свае важкія прычыны.

— Па-першае, такі помнік лічыўся не вельмі актуальным для таго часу — пагатоў, Валенцій Ваньковіч быў яшчэ мала вядомы нават у коле інтэлігенцыі, — распавядае сам Уладзімір Слабодчыкаў. — Ды і ніводнага яго жывапіснага палатна ў музеях Беларусі тады не было. Па-другое, даволі доўга ішла рэканструкцыя сядзібы роду Ваньковічаў у Верхнім горадзе для арганізацыі ў ёй Дома-музея гэтай знакамітай сям'і: будаваўся флігель, планаваўся двор... Таму месца для помніка ўвесь час было як бы "ў руху". Прытармазіў ход справы і недахоп фінансаў, патрэбных для ўстаноўкі ўжо адлітага ў бронзе помніка. Вось таму ўсё так і зацягнулася .

А пачыналася гэтая доўгая эпапея з помнікам яшчэ ў 1986 годзе, калі па праекце Ірыны Дорахавай ужо ішла рэстаўрацыя Дома Ваньковічаў. Пабудаваны ў канцы XVIII стагоддзя на вуліцы Валоскай (цяпер — Інтэрнацыянальная), ён належаў сваяку мастака Эдварду Ваньковічу і доўгі час быў своеасаблівым творчым салонам культурнай эліты той эпохі. Тут за "круглым сталом" у розны час збіраліся аднадумцы — выбітныя музычныя дзеячы, літаратары, мастакі, філосафы. У іх ліку — Ян Дамель, Томаш Зан, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Францішак Маеўскі, Юльян Корсак... Завітвалі і музыканты з еўрапейскай вядомасцю — Станіслаў Манюшка, Марыя Шыманская, Караль Ліпіньскі.

Зразумела, пан Валенцій тут гасцяваў часцей за іншых — хаця пастаянна пражываў у сядзібе свайго бацькі Малая Сляпянка, тагачасным прадмесці Мінска, дзе пасля заканчэння Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў ён стварыў сабе шыкоўную майстэрню.

Дык вось, яшчэ ў 1986 годзе Ірына Дорахава прапанавала Уладзіміру Слабодчыкаву распрацаваць праект камернага бюста-помніка Ваньковічу для ўстаноўкі перад гэтым мемарыяльным музеем. Скульптар пагадзіўся і ўзяўся за працу, папярэдне вывучыўшы ўсе даступныя дакументы, уключаючы ўспаміны сучаснікаў і выяўленчыя матэрыялы пра жыццё і творчасць жывапісца — па сутнасці, амаль забытага на сваёй радзіме. У аснову ўласна пластычнага бачання мастака ляглі два аўтапартрэты, зробленыя Ваньковічам у тэхніцы жывапісу і сангіны. На першапачатковай стадыі працы ў якасці архітэктара быў заяўлены Анатоль Лабачэўскі, пазней яго змяніў Юрый Казакоў.

Пакуль ішла праца над партрэтам, майстэрню Слабодчыкава наведаў Анатоль Аляксандравіч Анікейчык. На скульптурным станку ўбачыў амаль скончаны бюст Валенція Ваньковіча (цяпер, адліты ў бронзе, ён знаходзіцца ў зборы Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі). Ад убачанага масціты калега быў у захапленні. Уладзімір Іванавіч шмат тады распавёў свайму былому педагогу пра жыццё Ваньковіча, пра яго сяброўства з Міцкевічам, пра сустрэчы з Пушкіным, Вяземскім, Жукоўскім, пра ўплыў на сучаснікаў, многія з якіх імкнуліся яго пераймаць і ў адзенні, і ў шляхецкіх паводзінах, і наогул у ладзе жыцця. Гэта быў рамантык да мозга касцей, які па духу нагадваў лорда Байрана —- ганарліўцу, бунтара, багаборцу, авантурыста, асобу шчодрую і адначасова скнару. Як і Байран, Ваньковіч быў для кагосьці чалавекам складаным, магчыма, у чымсьці пыхлівым, часам поўным жоўці і рэзкім. Але адначасова — ранімым, з далікатным сэрцам, з тонкай душой. Пра гэта сведчаць і яго лісты, якія цяпер знаходзяцца ў фондах Дзяржаўнага архіва Літоўскай Рэспублікі.

Анатоля Анікейчыка ўразілі аўтапартрэты Ваньковіча, паказаныя яму Слабодчыкавым у рэпрадукцыях, а таксама малюнак італьянскім алоўкам, які выяўляў Пушкіна ў свабоднай позе на ўскрайку вадаёма-фантана. Доўгі час лічылася, што гэта аўтапартрэт самога Пушкіна. Але потым, калі акантаваны малюнак быў ускрыты, на адваротным баку выявілі подпіс аўтара: "Ваньковичъ". Аказваецца, гэта быў яго накід да жывапіснага кампазіцыйнага партрэта Пушкіна! На жаль, той партрэт не захаваўся. Аднак яго бачылі ў натуры Пётр Вяземскі, Марыя Шыманоўская, Францішак Малеўскі, пра яго 19 сакавіка 1828 года напісала ў сваім дзённіку дачка вядомай піяністкі Марыі Шыманоўскай — Цаліна (з 1834 года — жонка Адама Міцкевіча): *"Перад абедам сп. Малеўскі, сп. Вяземскі і сп. Пушкін прыйшлі да нас. Спадар Пушкін прынёс альбом, у якім ён зрабіў запіс. Разам з гэтым панствам мы паехалі на Васільеўскі востраў, дзе жыве мастак Ваньковіч. Там мы ўбачылі партрэты Міцкевіча і Пушкіна, вялікія, у рост, якія ён напісаў для выставы ў Варшаве ..."*

Анатоль Анікейчык загарэўся і вырашыў зрабіць у гэтую тэму і свой унёсак — балазе, ён ужо з 1982 года працаваў над цыклам сваёй Пушкініяны. Такім чынам, у 1988 годзе (за год да смерці скульптара), дзякуючы наведванню ім майстэрні Слабодчыкава, з'явілася кампазіцыя "Ваньковіч і Пушкін". Як і на тым малюнку, Анікейчык вылепіў той самы вадаём-фантан, а побач — маладыя і натхнёныя паэт і мастак. Час найвышэйшага росквіту таленту абодвух...

Мала таго, Анатоль Аляксандравіч зрабіў і свой сустрэчны праект бюста-помніка Ваньковічу для Дома-музея — нягледзячы на тое, што заказ быў даручаны персанальна Уладзіміру Слабодчыкаву. І калі экспертны Савет па манументальным мастацтве, які ўзначальваў тады скульптар Мікалай Рыжанкоў, а з боку Міністэрства культуры — першы намеснік міністра Уладзімір Гілеп, накіраваўся ў майстэрню Слабодчыкава, Анатоль Аляксандравіч (іх майстэрні былі побач) папрасіў экспертаў заадно зазірнуць да яго, каб паглядзець і ацаніць ягоную працу. Хто ж адмовіць у такой просьбе народнаму мастаку? У выніку савет разгледзеў абедзве праектныя прапановы, але праект Слабодчыкава пасля доўгіх дыскусій атрымаў пальму першынства.

Дарэчы, прыкладна такая самая сітуацыя адбылася ў 1972 годзе з бюстам-помнікам Янку Купалу для Араў-парку пад Нью-Ёркам, калі за права стаць пераможцам змагаліся Анатоль Анікейчык, які атрымаў афіцыйны заказ, і яго настаўнік Андрэй Бембель, які прадставіў сустрэчны праект. Але тады ў выйгрышы апынуўся Анікейчык — што ў выніку, на жаль, негатыўна адбілася на асабістых узаемаадносінах паміж настаўнікам і вучнем...

У 1997 годзе Слабодчыкаў прыступіў да практычнага ажыццяўлення замовы. Партрэт адліў у гіпсе. Напаследзе чакала адліўка ў бронзе. Але тут нечакана паўстала праблема: новы склад Манументальна-экспертнага савета на чале з Іванам Міско вырашыў, што пагрудны бюст мастака для помніка занадта вялікі, хоць супрацоўнікам музея ён спадабаўся (цяпер ён у Літаратурным музеі Янкі Купалы). Праца прыпынілася... А ўжо ішоў 1999-ты год. І тады Слабодчыкаў разам з архітэктарамі Юрыем Казаковым і Ірынай Дорахавай на свае страх і рызыку прыняў неардынарнае рашэнне: ляпіць постаць Ваньковіча ў памеры больш за два метры для ўстаноўкі яе на невысокім пастаменце на пляцоўцы пад старым вязам, недалёка ад галоўнага ўваходу ў музей. Тым больш набліжаўся юбілей мастака.

Барыс КРЭПАК

Заканчэнне — у **наступным нумары "К".**

Таямніцы Манюшкаў

Частка XIV

(Працяг. Пачатак у №№ 12 — 18, 20 — 26)

МЮЛЕРЫ

Распавядаючы ў папярэдніх частках пра жонку кампазітара Аляксандру Мюлер, мы ў самых агульных словах сказалі і пра яе сям'ю. Цяпер нас чакае гісторыя Мюлераў у канцэнтраваным выглядзе. То-бок, усё самае цікавае і па магчымасці новае. Бо, у адрозненне ад Закрэўскіх, сваякоў Аляксандры па кудзелі, пра Мюлераў было вядома даволі шмат. Ізноў жа, дзякуючы перш за ўсё лекару Станіславу Мараўскаму. Яго знаёмства з Мюлерамі і непадзеленае каханне да Марыі, маці Аляксандры, стала прычынай моцных душэўных пакут, а потым прымусіла ўзяцца за пяро і пакінуць неверагодна цікавыя ўспаміны.

РЭПАТРЫЯНТ АБО "ТУБЫЛЕЦ"?

У каментарыях да ўспамінаў Станіслава Мараўскага, перавыдадзеных у 1959-м пад назвай "Kilka lat mlodosci mojej w Wilnie. 1818 — 1825", падаюцца даволі цікавыя звесткі пра заснавальніка віленскай галіны роду Яна Мюлера. На падставе дакументаў віленскага архіва выдаўцы сцвярджаюць, што "*ў 1795 годзе, Ян, сын Яна Мюлера, новааселы, 46 год, набілітаваны ў 1790, родам з Львова. Жанаты з панай Альжбетай Краўз, дачкой Якуба Краўза, родам з Варшавы. Мае двух сыноў: Ксаверы, 14 год, Станіслаў, 11 год. Мае мураваны дом на вуліцы Траецкай пад нумарам 427 ім самім набыты ў яснавяльможных Зянковічаў на гарадской зямлі. Заўсёды жыве ў горадзе, нікуды не выязжаючы цягам 20 год. Жыве ў палацы Яснаасвечанага князя Сапегі, генерала, пад 432. (Палац Сапегі на вуліцы Святаянскай № 21 потым быў аддадзены царскай уладай пад "Расійскі дом".) Займаецца купецкім гандлем. У 1789 быў лаўнікам і паслом на сойм, у 1791 апеляцыйным суддзёй, у 1793 паслом на гарадзенскі сойм і радцам. Ян Мюлер быў таксама сябрам Цэнтральнай Дэпутацыі Вялікага Княства Літоўскага, ...бургамістрам Вільні. У карэце Мюлера вывезлі гетмана Касакоўскага на месца экзекуцыі*".

Дапоўнім гэтую інфармацыю з дапамогай іншых архіўных крыніц. У розных лістах да князя Караля Станіслава Радзівіла ў 1784 і 1788 згадваецца нейкі "купец Мюлер", які мае пэўныя інтарэсы ў Наваградскім ваяводстве і "*высока шануе добразычлівасць князя да сябе*". Не магу сцвярджаць, што гаворка вядзецца менавіта пра Яна Мюлера, бо Мюлераў ва ўсе часы ў Вільні было вельмі шмат, і, верагодна, праз аднаго яны займаліся гандлем. Але ёсць адна зачэпка. Закрэўскія, як вядома, "патрапілі ў тэатральнае сіло" да Радзівіла ў 1784-м. Пасля смерці князя і вайны 1792 года Закрэўскія перабіраюцца ў Вільню. І літаральна адразу завязваюць "кумаўскія" стасункі з Мюлерамі. А крыху пазней дзве дачкі Закрэўскіх — Марыяна і Альжбета — сталі жонкамі двух сыноў Яна Мюлера — Ксаверыя і Станіслава.

Таксама патрабуе дадатковай праверкі інфармацыя пра "новааселасць" Яна Мюлера "з Львова" і Альжбеты Краўзэ "з Варшавы". І Мюлеры, і Краўзы, і Вернеры (жонка Закрэўскага — з Вернераў) былі шырока прадстаўлены сярод віленскіх кальвіністаў у XVIII стагоддзі. І цалкам можа быць, што карані Мюлераў-Краўзаў насамрэч віленскія. А часова выехаць са сталіцы іх або іхніх бацькоў прымусілі якія-небудзь палітычныя закалоты 1760 — 1770-х. І вярнуліся яны з эміграцыі ўжо каталікамі.

Шлюб Мюлеры ўзялі да 25 мая 1780 года. У гэты дзень Альжбета (ужо як Мюлер) асіставала на хросце ў Гілеўскіх. Але першанец іх, Францішак-Ксаверы, нарадзіўся і быў ахрышчаны толькі 12 снежня 1781 года ў касцёле святога Яна. Хрост правёў ксёндз Міхал Александровіч, кумамі ж малога Ксаверыя сталі вялікалітоўскі вайсковец Ігнат Бенцдорф і Петранэла Мінкевіч, дачка віленскага бургамістра. Асіставалі маёр расійскіх войск Ян Вэбтар і жонка бургамістра Вільні Элеанора Прамянецкая.

У гэтай метрыцы бацька Ксаверыя запісаны як Фрыдэрык Мюлер. У далейшым Ёган Фрыдэрык (калі ён сапраўды раней быў кальвіністам), пазбавіцца "нямецкага пачатку" і будзе згадвацца пад больш звычным, "славянскім" імем Ян. Колькі ўсяго было дзяцей у гэтай сям'і, пакуль невядома. Але тое, што адных хлопцаў было больш чым два, устанавіць удалося.

Праз шэсць гадоў пасля нараджэння будучага цесця Станіслава Манюшкі Ксаверыя быў ахрышчаны Станіслаў (цесць злога генія Манюшкі Караля Штурма). 14 сакавіка 1790 усё там жа, у касцёле святога Яна ахрысцілі Юзафа-Антона. Апошняя сына Мюлераў, Казіміра, ахрысцілі 15 лютага 1798 года. Кумой яго стала тэатралка Марыя, жонка Станіслава Закрэўскага. Па ўсёй верагоднасці двое апошніх сыноў пражылі нядоўга, бо пра далейшы іх лёс звестак знайсці не ўдалося.

Варта нагадаць, што будучая цешча Манюшкі Марыяна Закрэўская, нарадзілася каля 1795 года, але дапаўненне хросту, які спярша быў зроблены адной вадой, адбылося толькі праз сем гадоў —19 лістапада 1802-га ў касцёле святога Яна, парафіянамі якога сталі Закрэўскія пасля пераселення са Слуцка ў Вільню. У той самы дзень дапоўнілі і хрост старэйшай сястры Марыяны —Альжбеты, і яе кумой стала ўдава Яна Мюлера: той не так даўно ўжо адышоў у вечнасць.

Памёр віленскі бургамістр 24 красавіка 1801 года. Вельмі цікава, што літаральна наконадні гарадская рада ўхваліла праект заснавання новых могілак на Росах. Сцвярджаецца, нібы першым, каго там пахавалі, стаў менавіта Ян Мюлер. Дарэчы, на тым самым пагорку, дзе калісьці знаходзілася магіла Мюлера, летась былі перапахаваныя паўстанцы 1863 года, чые парэшткі знайшлі на гары Гедыміна.

Калі і кім была знішчаная магіла Мюлера, нам невядома. Але варта адзначыць, што практыка крадзяжу старых надмагільных пліт, якая сустракаецца і цяпер, у XIX — XX стагоддзях была пастаўлена на паток. Прынамсі, на Росах.

ПАКАРАННЕ ПАД ГУЧНЫЯ ВОПЛЕСКІ

Як нам ужо вядома, у 1794 годзе Ян Мюлер, як і Станіслаў Закрэўскі, падтрымаў паўстанне, якім у ВКЛ кіраваў генерал Якуб Ясінскі. У момант яго выбуху вялікі гетман літоўскі Шыман Касакоўскі — славуты дзеяч прарасійскай Таргавіцкай канфедэрацыі, якога лічылі калабарантам — жыў у доме Мюлераў. Сярод жаўнераў, якія ахоўвалі ваеначальніка, былі і тыя, хто далучыўся да паўстання. Таму калі паўстанцы прыйшлі за "ненавіснай усёй Літве" асобай, варта фактычна без супраціву здала пазіцыі. Арыштанта на карэце Мюлераў перавезлі ў цэйхгауз. Адкуль, пасля вынясення 25 красавіка смяротнага прысуду, Касакоўскі ў блакітнай карэце, запрэжанай парай белых коней, пад моцнай аховай пяхоты і кавалерыі адправіўся на ратушную плошчу, дзе ўжо стаялі шыбеніцы. Пасля таго, як адвакатам віленскіх судоў Гаспарам Эльснерам быў зачытаны дэкрэт, у якім пералічваліся ўсе правіны гетмана, надышоў час споведзі, а потым і экзекуцыі. Калі справа была зробленая, нехта з натоўпу закрычаў "Віват!" і люд, які сабраўся на плошчы, падхапіў гэты воклiч і разнёс па ўсіх вуліцах горада.

Адным з сяброў Судовай камісіі Найвышэйшай рады паўстання ВКЛ, якая вынесла такі суворы прысуд, быў палкоўнік Нацыянальнай кавалерыі ВКЛ Самуэль Корсак. Той самы, які 19 красавіка 1773 года стаў поплеч з Тадэвушам Рэйтанам, баронячы і гонар ВКЛ, і незалежнасць радзімы. Дарэчы, абодва былі з Наваградскага ваяводства і ўсведамлялі сябе ліцьвінамі.

За тое, што Корсак быў адным з тых, хто адправіў на смерць расійскага прыспешніка Касакоўскага, пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай яго расшуквала паліцыя. Але марна. Ён ад'ехаў за мяжу і вярнуўся на радзіму толькі ў 1812 годзе разам з войскамі Напалеона.

ДОМ НА НЯМЕЦКАЙ

Пасля смерці Яна Мюлера яго ўдава Альжбета нядоўга была ў самоце. У 1802 годзе падчас хросту старэйшай дачкі Станіслава Закрэўскага, Альжбеты, разам з ёй як асістэнт прысутнічаў капітан расійскага войска Георгій Лісаневіч. Але, несумненна, што пазнаёміліся ўсе ўдзельнікі той урачыстасці задоўга да яе. У выніку, 18 лістапада 1804 года ў тым самым касцёле святога Яна ў прысутнасці сведкаў Ігната Грабоўскага, Дзмітрыя Высочына і Томаса Рэйзера адбыўся шлюб Лісаневіча з удавой Мюлер.

Маладыя сталі жыць у доме Мюлераў на Нямецкай, 6. Будынак гэты мае даўнюю гісторыю і, на шчасце, захаваўся да нашых дзён. Да Мюлераў ім валодалі Бжастоўскія, а перад імі, у 1750-х, — Флемінгі. А ў другой палове XIX стагоддзя дом перайшоў ва ўласнасць Венслаўскіх, у руках якіх заставаўся да канца вайны. Цяпер там офісы, таму ў будынак патрапіць даволі складана. Мясцовымі энтузіястамі неаднаразова і ў розныя часы прадпрымаліся спробы стварыць там нешта накшталт музейчыка, але, падобна, пакуль безвынікова.

Самы час нагадаць, што менавіта ў гэтай камяніцы нарадзілася ў 1818 годзе жонка Станіслава Манюшкі, там адбылася і першая пастаноўка славутай у будучыні оперы "Галька". А потым з гэтага дома сям'я кампазітара была літаральна "выкінута на вуліцу" — руплівасцю швагера Манюшкі Яна Мюлера і Караля Штурма. Таму Станіслаў і перабраўся канчаткова ў Варшаву, дзе ён атрымаў сталую працу пры Вялікім тэатры.

А завяршэнне гісторыі Мюлераў — у наступным нумары.

Зміцер ЮРКЕВІЧ,
гісторык- архівіст

Працяг —
у наступных нумарах "К".

Фота Зміцера ЮРКЕВІЧА

Капліца на Росах у Вільні. 2019 год.

Дом Мюлераў на Нямецкай, 6. Здымак 1920-х.

Вялікі гетман Літоўскі Сымон Касакоўскі. Мастак Ян Дамель. 1812 год.

Метрыка хросту Ксаверыя Мюлера.

Кіно пад зоркамі ў... слухаўках

Пандэмія ўносіць свае карэктывы ў жыццё кінааматараў: зараз кіно можна (а галоўнае, бяспечна) глядзець на вуліцы, на вольным паветры, прынамсі ў двары Мемарыяльнай майстэрні-музея Заіра Азгура. Тут глядзяць стужкі сусветнага кінематографа пад зоркамі кожную сераду і пятніцу ў 22:00. Квіток у свет рамантыкі каштуе 7 BYN, а сама атмасфера — неацэнная. Але пра ўсё па парадку.

На прагляды фільмаў праекта Cinemascope #shhh 2020 рэкамендуецца браць адзенне па надвор'і: ніколі не ведаеш, як будзе на вуліцы. А асабіста ад сябе можна параіць узяць коўдру ці нешта ўтульнае, на што можна сесці на траву. Так атмасферу кіно на вольным паветры можна адчуць лепш. У рамках праекта стужкі глядзяць з дапамогай бесправадных слухавак. Выглядае гэта цікава і незвычайна. Яны і ёсць адзін з галоўных плюсаў такіх паказаў!

"Па-першае, у слухаўках кожны можа рэгуляваць гучнасць самастойна. Для кагосьці гэта можа быць важна. У кінатэатрах нічога з гэтым не зробіш: сядзіш і гучнасць цісне на вушы. Ад гэтага робіцца нават нецікава. Па-другое, чалавеку, які прыйшоў на наш паказ, нішто не замінае: ні чмяканне суседзяў побач, ні карканне варон, нават есці можна, таму што на вуліцы не так чутныя пахі, як у зале кінатэатра. Яшчэ тут можна пасядзець на траве!", — каментуюць паказы арганізатары праекта Вольга Надольская і Гера Глік.

Колькасць месцаў на сеансы Cinemascope #shhh 2020 абмежаваная. "Зала" на вольным паветры — 50 чалавек. Такая лічба абумоўлена двума фактарамі: колькасцю слухавак і месцаў у скульптурнай зале музея, куды пасадзяць аматараў добрага кіно ў выпадку дажджу. Таму квіткі разыходзяцца досыць хутка. Галоўнае паспяваць купляць!

Што да праграмы #shhh 2020: у гэтым месяцы яшчэ ёсць магчымасць паглядзець "Зазі ў метро" (15 ліпеня), "Доктар Стрэйнджлаў, ці Як навучыцца не хвалявацца і палюбіць атамную бомбу" (17 ліпеня), "Незнаёмыя ў цягніку" (22 ліпеня), "Ціхае жыццё" (24 ліпеня), "Уладар мух" (29 ліпеня) і "Сямейка Адамс" (31 ліпеня). Усе фільмы не вельмі доўгія. Яны падабраны так, каб можна было паспець даехаць дадому на транспарце. Так што хвалявацца за позні час не варта.

Паліна БЯЗУГЛАЯ
Фота аўтара

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
■ **"Сусвет Язэпа Драздовіча".**
Выставы:
■ Выстава твораў мастакоў Беларусі — юбіляраў 2020 года **"Плынь часу"** (ў рамках праекта "Нашы калекцыі").
■ Выстава **"Чырвоны — код нацыі. Сакральнасць, эстэтыка, улада"** ("дыялог" твораў розных эпох, відаў і стылістычных кірункаў) — да 2 жніўня.
■ Выстава твораў вядомага беларускага мастака Уладзіміра Сулкоўскага (19.07.1950 — 16.05.2013) **"Яго зямля, яго людзі"**, прымеркаваная да 70-годдзя з дня яго нараджэння — да 23 жніўня.
■ Сумесны культурна-адукацыйны праект-квэст Нацыянальнага мастацкага музея і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны **"Аб Вялікай Айчыннай..."**
■ **"Фердынанд Рушчыц"**: віртуальная выстава да 150-годдзя з дня нараджэння.
■ Віртуальная выстава **"Дзеці мастакоў"** (хто глядзіць на нас з дзіцячых партрэтаў, што належаць пэндзлю вядомых майстроў жывапісу, графікі, скульптуры?)

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 327 88 78.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".**
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".**
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Повязь часоў"**, якая знаёміць з багаццем вобразаў традыцыйнага ручніка.
■ Майстар-клас па традыцыйнай тэхніцы роспісу вялікодных яек "Пісанкі".
Кожную няделю а 12-й.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66.
Музей працуе: аўторак-нядзеля з 10.00 да 18.00 (касы да 17.30), панядзелак — выхадны.
■ Пастаянная экспазіцыя.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Аўтарская выстава карцін Алеся Сурава **"Паштоўкі з мястэчка"** — да 15 лістапада.
■ Гістарычны квэст **"Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў"**. Па папярэдніх заяўках.
Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
Вул. Гейсіка, 1.
■ Выстава работ маладога мастака Ксеніі Сушы **"Дакрананне"** — да 16 жніўня.
Ратуша:
г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Квэст **"Выходкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.
Слуцкая Брама:
■ Выстава каталіцкіх, уніяцкіх і праваслаўных крыжоў розных гістарычных перыядаў **"Крыж: арыенцір, сімвал, памяць"** — да 30 верасня.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі".**
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку".**
■ Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя".**
■ Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
■ Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар...", "Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак", "Капрызы моды ракако".**
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку".**
■ Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
■ Музейная фотапляцоўка.

ПА ПЫТАННЯХ РАЗМЯШЧЭННЯ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ "КУЛЬТУРА"
звяртайцеся па тэлефоне
+ 375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41
альбо пішыце на электронны адрас
kultura@tut.by!

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.
■ Выставачны праект **"Беларусь — яднанне"**.
■ Выстава твораў **"Мастакі Бабруйска"**.
■ Выстава графікі і жывапісу Васіля Баранава.
■ Групавая выстава сямі мастакоў – Пётры Багданава, Вольгі Бычко, Анатоля Волкава, Алега і Алены Карповічаў, Віктара Мікіты і Юрыя Піскуна.
Выставы працуюць да 19 ліпеня.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

магазіны "Белсаюздрук"	кіёскі "Белсаюздрук"
Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".	ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.
Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".	Праспект Пераможцаў, 5.
	Вуліца Рабкораўская, 17.
Праспект Незалежнасці, 44.	Праспект Незалежнасці, 68, В.
Вуліца Валадарскага, 16.	Вуліца Лабанка, 2.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").